Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Натар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244 (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. На 3 — 2 р. 70 к. На 6 — 4 р. — к. На 1 год — 8 р. — к. Змена адрасу: іншагародняя — 20 к., мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок кампарэлі пасьля тэксту — р. 60 к. За радок кампарэлі пасьпор тэксту 1 р. — к. За радок кампарэлі поруч тэкстам 1 р. 50 к. Абвесткі на 50 проц. дарожэй. Зверх тарыфу бярэцца 10 проц. падатку.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 к. Беспрацоўн. і чырвонаармейцам за дакумэнт — 15 к. За кожны дадатковы — 5 к. Публікацыі ЗАГСаў—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 46 (2535) Серада, 27-га лютага 1929 г.

Ніякага адступленьня ад генэральнае лініі партыі.

Бязьлітасна ўдарыць па ўсіх спробах рэвізіі ленінізму.

Голас маскоускае губпартканфэрэнцыі.

МАСКВА, 25-II. На ранішнім пасяджэньні губпартканфэрэнцыі 25 лютага адбываліся далей спрэчкі па дакладзе Молатава. Жадаючых выступіць запісалася каля 150 чалавек. Асноўнае ў спрэчках, гэта—ПОЎНАЯ ЎХВАЛА ГЕНЭРАЛЬНАЕ ЛІНІІ ЦК, НАКІРАВАНАЕ НА ЎЗМАЦНЕНЬНЕ ТЭМПУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ КРАЮ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ СЯЛЯНСКІХ ГАСПАДАРАК. Дэлегаты рашуча патрабуюць ДАЦЬ СУРОВЫ АДПОР ПРАВЫМ ухілістам і ПРЫМІРЭНЦАМ. Яны адназгодна праклінаюць ужываць захады партыйнага ўзьдзейнічаньня на таварышоў, якія па той ці іншай прычыне парушаюць партыйную дысцыпліну. Гэтую думку асабліва рашуча выказваюць дэлегаты фабрык і заводаў.

На дзённым пасяджэньні канфэрэнцыю віталі дэлегацыі партыйных арганізацый Тулы, Разані, Цьверы і інш. гарадоў. Канфэрэнцыя атрымала шмат прывітальных тэлеграм ад правінцыяльных партыйных арганізацый і рабочых і служачых розных прадпрыемстваў.

Увечары 25 лютага цягнуліся далей спрэчкі па дакладзе Молатава. Сэкратар МГСПС ДРОЖЖЫН выступіў з крытыкаю заганаў прафсаюзнальных арганізацый. Асобны кіраўнікі прафсаюзаў выяўляюць у апошні час некаторую нашчырасьць і жаданьне ўтаіць свае недахопы. Гэтую фальш партыя павінна сваячасна зьнішчыць.

ФЭЛІКС КОН прысьвяціў сваю прамову бязьлітаснай крытыцы «тэорый» правых ухілістаў. Мы павінны заявіць—сказаў ён,—што ТЭОРЫЯ ЎРОСТВАНЬНЯ КУЛАКА Ў САЦЫЯЛІЗМ НЯ НАША. ЯНА Ў АНТЫЛЕНІНСКАЯ ТЭОРЫЯ. Каб з посьпехам перамагчы цяжкасьці, якія стаяць перад партыяй, мы павінны рашуча змагацца з узьнімаючым галаву правым ухілам. На пралетарскія элемэнты—гаворыць Фэлікс Кон—робяць нажым чужыя ўплывы ня толькі ў галіне палітыкі, але і ў такіх канкрэтных галінах, як прадукцыйнасьць працы, зьніжэньне сабекошту і г. д. Адсталыя групы рабочых, якія нядаўна выйшлі з вёскі, уносяць дэзарганізавацасьць і недысцыплінаванасьць у асяродзьдзе арганізаванага пралетарыяту. ТРЭБА, КАБ НІХТО НЕ АДВАЖЫЎСЯ ПАРУШЫЦЬ ДЫСЦЫПЛІНУ. Гэта-ж павінна быць нашым лёзунгам таксама і ў адносінах тых членаў партыі, на якіх нападае перакуп і якія паслабляюць бальшавіцкую дысцыпліну. Трэба стварыць такія маральныя абставіны, пры якіх-бы ніхто не адважыўся парушаць партыйную дысцыпліну. Гэтыя словы канфэрэнцыя сустрэла гучнымі воплескамі.

У канцы вячэрняга пасяджэньня спрэчкі былі скончаны. 26 раніцою заключнае слова Молатава.

ДЫПЛЁМАТЫЧНЫЯ МІСІІ ПАКІНУЛІ КАБУЛ.

ЗАСТАЛІСЯ ТОЛЬКІ ПРАДСТАЎНІЦТВЫ СССР, ПЭРСІІ І ТУРЦЫІ.

КАБУЛ, 25-II. Брытанскае пасольства сёньня (25-га лютага) раніцою на 8-мі самалётах выехала з Кабулу ў поўным складзе, на чале з пасланьнікам Гэмфрысам. Пасьля выезду ўсіх вэўрапейскіх місій у Кабуле застаюцца вараз толькі місіі СССР, Турцыі, Пэрсіі і частка складу нямецкіх місій. Паветраныя зносіны між Кабулам і Індыяй, якія падтрымліваліся ангельскімі самалётамі, цяпер, пасьля эвакуацыі брытанскага пасольства, будуць спынены.

ЛЁНДАН, 25-2. Агенцтва Рэйтэра паведамляе: „У Пэшавар з Кабулу прыехаў на самалёце ангельскі пасланьнік у Аўганістане з усім штабам кабульскае місіі.

НОВЫ АНГЕЛЬСКІ АГЕНТ?

ЛЁНДАН, 23-2. Бамбэйскі карэспандэнт «Дэйлі Тэлеграф» паведамляе, што Надыр-хан (сваяк Аманулы, які выехаў з Аўганістану з прычыны разыходзін з Аманулаю ў 1925 годзе і вярнуўся гэтымі днямі ў Аўганістан з Эўропы) перад тым, як ступіць на ўзьбярэжжа, пасьля прыходу параходу ў Бамбэй, меў яшчэ на параходзе сакрэтную нараду з прадстаўніком палітычнага дэпартамэнту (ведамства міністэрства замежных спраў) англа-індыйскага ўраду.

АЎГАНСКІЯ ГАНДЛЁВЫЯ АГЕНТУРЫ ЗАГРАНІЦАЮ НЕ ПАДНАЧАЛЬВАЮЦЦА БАЧЭ-САКО.

ЛЁНДАН, 25-II. „Дэйлі Тэлеграф" паведамляе, што між Хабібулаю (Бачэ-Сакао) і пэшаварскім гандлёвым прадстаўніком Аўганістану выбухнула сварка. Пэшаварскі гандлёвы прадстаўнік адмовіўся перадаць асобе, назначанай Хабібулаю, буйную суму грошай блізка 225.000 фунтаў стэрлінгаў (2.250.000 руб.). Гандлёвы прадстаўнік заявіў, што ён ня выдасьць грошай нікому, пакуль не высьветліцца, хто зьяўляецца правамоцным кандыдатам на аўганскі трон.

ПРАЛЕТАРЫІ ВЕНЫ АДБІЛІ ФАШЫСТАЎСКУЮ ВЫЛАЗКУ.

ДЭМАНСТРАЦЫЯ ХЭЙМВЭРУ ВЫКЛІКАЛА КОНТР-ДЭМАНСТРАЦЫІ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ РАБОЧЫХ ПАД КАМУНІСТЫЧНЫМІ ЛЁЗУНГАМІ.—АРЫШТОВАН ЧЛЕН ЦК КАМПАРТЫІ БЭНЭДЫКТ.

ВЕНА, 25-2. Учора ў Вене адначасна адбыліся асобныя дэманстрацыі сяброў хэймвэру (фашыская арганізацыя) з удзелам 4-х тысяч чалавек і сяброў сацыял-дэмакратычнага шуцбунду, з удзелам 15-ці тысяч чалавек.

У рабочых райёнах працэсія хэймвэру была спаткана лаянкаю рабочых мас і часткова контр-дэманстрацыямі чырвонае рабочае абароны. Выконваючы лёзунг аўстрыйскае кампартыі, рабочыя некаторых пунктаў перашкодзілі працэсіі хэймвэру. Пры гэтым здарылася некалькі стычак з паліцыяй, якая арыштавала блізка 70-ці рабочых, сярод іх шмат камуністаў і сяброў чырвонае рабочае абароны. Сябра цэнтральнага камітэту аўстрыйскае кампартыі Бэнэдыкт аддадзен пад суд.

ШМАТМІЛЬЁННЫЯ КРЭДЫТЫ ДЛЯ СССР У АЎСТРЫІ.

ВЕНА, 25-II. Венскі муніцыпалітэт бяз спрэчак ухваліў прадоўжыць час выкарыстаньня гарантый венскага муніцыпалітэту для гандлёвых крэдытаў, нададзеных СССР. Час выкарыстаньня рэшты 10 мільёнаў шылінгаў (блізка 2.800.000 рублёў) з належнае часткі крэдыту прадоўжан да 30-га чэрвеня 1930 году. Для рэшты 40 мільёнаў шылінгаў (блізка 11.200.000 рублёў) крэдыту заказы павінны быць здадзены не пазьней 31 сьнежня 1929 году, а апошнім тэрмінам разрахунку ўстанаўляецца 31 сьнежня 1932 г.

Наглыя антысавецкія выступленьні латвійскага друку.

РЫГА, 25-2. Орган правых гандлёвых колаў і дробных прамыслоўцаў «Латвіяс Саргс» выступіў з нячуваным на сваёй нагласьці артыкулам, накіраваным проці савецкіх устаноў у Латвіі, у тым ліку, і проці паўнамоцнага прадстаўніцтва, паўтараючы старыя выдумкі, што «у паўнамоцным прадстаўніцтве" знаходзіцца цэнтр, які кіруе шпіянажам на Латвіі» і г. д.

У зьвязку з кампаніяй часткі латвійскага друку, савецкае паўнамоцнае прадстаўніцтва перадало сёньня міністэрству замежных спраў ноту, у якой адзначае, што ўсе заявы паўнамоцнага прадстаўніцтва аб бязупыннym цкаваньні асобных савецкіх устаноў у латвійскім друку і яго выпадах проці паўнамоцнага прадстаўніцтва не далі станоўчых вынікаў. Зусім нячуваны ў гэтым сэнсе зьяўляецца апошні артыкул «Латвіяс Саргс». У зьвязку з гэтым паўнамоцнае прадстаўніцтва заяўляе рушучы пратэст проці насупынnага бязадказнага цкаванья яго ў частцы латвійскага друку і настайвае ўжыць захады, каб зьмяніць становішча нецярпімае для нармальнае працы паўнамоцнага прадстаўніцтва.

Амэрыканскі імпэрыялізм на ваяўнічых пазіцыях.

12 МЛН. ДАЛЯРАЎ НА КРЭЙСЭРЫ.—ВОЙСКА ЗЛ. ШТАТАЎ ЗАСТАЮЦЦА Ў НІКАРАГУА.

ВАШЫНГТОН, 23-2. Сэнат Злучаных Штатаў зацьвердзіў бюджэт марскога міністэрства ў суме 360-ці мільёнаў даляраў. З гэтае сумы 12 мільёнаў асыгнавана на пабудову новых крэйсэраў.

На пасяджэньні напярэдадні група сэнатараў—праціўнікаў Куліджа—падала рэзалюцыю адклікаць амэрыканскае войска з Нікарагуа. Рэзалюцыя была ўхвалена, бо шмат прыхільнікаў Куліджа ня было ў сэнаце. На другі дзень Келёг і Кулідж выказаліся проці адкліку амэрыканскага войска і неадступа прасілі сэнат падтрымаць палітыку ўраду ў гэтым пытаньні. Аднолося паўторнае галасаваньне гэтае рэзалюцыі, і яна была адхілена, бо двое рэспубліканцаў і 5 дэмакратаў якія раней галасавалі за рэзалюцыю, гэты раз падалі свае галасы проці рэзалюцыі.

Бора абодвы разы галасаваў проці ўраду, г. зн. за адклік.

Спатканьне Кемпбэла з Гувэрам.

ВАШЫНГТОН, 25-II. Выдатны дзеяч сельскае гаспадаркі Злучаных Штатаў Кемпбэл, які нядаўна з СССР, спаткаўся з Гувэрам (новаабраны прэзыдэнт Злуч. Штатаў) і абмяркоўваў з ім пытаньне аб СССР.

Застрэльшчыкі новае вайны за працаю.

Англа-французскі імпэрыялізм мэтадамі тайнае дыплёматыі і ўзброеньнем дробных дзяржаў падрыхтоўвае глебу для справакаваньня новага крывавага злачынства.

Тайная згода між Францыяй, Англіяй і Бэльгіяй.

БЭРЛІН, 25-2. Выкрыцьці галяндзкае газэты «Утрэхт Дагблят» аб існаваньні тайнага франка-бэльгійскага вайсковага ўгавору зрабілі ў нямецкіх палітычных колах вялікае ўражаньне. Усе газэты аднадушна адзначаюць, што няма ніякіх падстаў ня верыць у правільнасьць выкрываньняў, і што франка-бэльгійская згода зьяўляецца аплявухаю для ўсяе палітыкі Лёкарно і Лігі Нацый.

„Дэйтшэ Дыплёматыш Палітыш Карэспандэнцэт" (афіцыёз міністэрства замежных спраў) папамінае, што арт. 17 статуту Лігі Нацый гаворыць аб безадкладнай рэгістрацыі і агалашэньні ўсіх угавораў, якія падпісваюцца сябрамі Лігі Нацый. «Калі-ж Францыя і Бэльгія,—піша газэта,—не зважаючы на гэта, падпісваюць угавор з выразным жаданьнем захаваць яго ў тайне, падпісваюць, ня выконваючы пастаноў Лігі Нацый, калі яны, да таго-ж яшчэ перадаюць Лізе Нацый аб абмене потамі, якія толькі заблытваюць праўду, бо зацяўляюць, што ўгавор мае на мэце ўмацніць вірныя гарантыі Лігі Нацый і перашкаджае ўзброеньням—дык гэты сафісцкі абход толькі нядаўна ўрачыста ўзятых на сябе абавязацельстваў павінен быць растлумачан Лізе Нацый Францыяй і Бэльгіяй».

«Дэйтшэ Альгемэйнэ Цэйтунг» піша: «Васенны ўгавор між Францыяй і Бэльгіяй сьведчыць, што Парыж і Брусэль робяць стаўку на магчымасьць пашырэньня сферы свайго панаваньня на ўсходзе пры дапамозе вайны. Трэба спадзявацца, што агалашэньне згоды развее небясьпечныя ілюзіі пацыфістаў і высьветліць для грамадзкае думкі загранічаю хто з дзяржаў сучаснае Эўропы зьяўляецца сапраўдным парушыцелем спакою».

«Лёкаль Анцэйгэр» падкрэсьлівае, што тайная згода, а асабліва згода 1927-га году не пакідае магчымасьці нават для агаворкі, хіба толькі нязграбнае маны. „Згода,—заяўляе газэта,—ішлі раз даводзіць, што Лёкарно —нішто іншае, як здань".

„Яны адхіляюць"...

ЛЁНДАН, 25-2. Агенцтва Рэйтэра паведамляе: «У аўтарытэтных ангельскіх колах нічога невядома наконт паведамленьняў аднае галяндзкае газэты, што ў 1927 г. была нібыта падпісана тайная ваенная згода між Англіяй і Бэльгіяй. Паведамленьне аб згодзе між Англіяй і Бэльгіяй у гэтых колах лічыцца вусім фантастычным».

ПАРЫЖ, 25-2. Агенцтва Гавас паведамляе: «Не зважаючы на завярэньні аднае галяндзкае газэты, французкія і бэльгійскія аўтарытэтныя колы фармальна адхіляюць паведамленьне, што між Францыяй і Бэльгіяй быў падпісан які-небудзь сакратны ваенны ўгавор».

„ТАЯ-Ж ГРУПОЎКА ДЗЯРЖАЎ, ЯК І Ў 1914 г."

ПОЎНЫ КРАХ ЛЁКАРНСКІХ ІЛЮЗІЙ У НЯМЕЧЧЫНЕ.

БЭРЛІН, 25-2 Наконт паведамленьня аб франка-бэльгійскім ваенным угаворы нацыяналіцкая «Крэйцэйтунг» піша: „Базумоўна, франка-бэльгійскі ўгавор мае шчыльную сувязь з англа-французскаю марскою згодаю. Праз 10 гадоў пасьля аднаўленьня спакою існуе наражаецца такая-ж групоўка дзяржаў, як і перад вайною. Існуе замыкаецца кола навакол Нямеччыны; на Захадзе гэта робіцца пры дапамозе франка-бэльгійскага ваеннага ўгавору, на Ўсходзе існуе сетка ўгавораў між Францыяй і дзяржавамі, якія адыгрываюць ролю яе спадручных. Франка-бэльгійскі ўгавор азначае для Нямеччыны сур'ёзную перасьцярогу і новы довад поўнага крушэньня распачатае ў Лёкарно палітыкі зьбліжэньня з заходнімі дзяржавамі".

ФРАНЦЫЯ БУДУЕ ФЛЁТ НАШЫМ СУСЕДЗЯМ.

ПАРЫЖ, 25-II. Орган французскае кампартыі „Юманіта" зьмяшчае весткі аб вайсковых суднах, якія будуюцца ў Францыі для французскага, а таксама югаслаўскага, польскага, румынскага і грэцкага флётаў. У сучасны момант будуецца больш 60 адзінак для французскага флёту і 10 адзінак для чужаземных дзяржаў, у тым ліку для Польшчы 2 контр-мінаносцы на поўтары тысячы тон, адна подводная лодка ў 1.250 тон і 2 падводныя лодкі па 900 тон. Апроч таго, будуецца па 2 падводныя лодкі для Грэцыі, Югаславіі і г. д.

Адзначаючы далей факты ўзмоцненае пасылкі з Францыі вайсковых прыладаў для гэтых краёў і падкрэсьліваючы кіруючую ролю Францыі ў арганізацыі польскіх і балканскіх армій для выступленьня проці СССР, «Юманітэ» заклікае рабочых да актыўнае абароны Савецкага Саюзу.

2 бастыёны англа-французскага капіталу на Ўсходзе.

МІРАНЭСКУ У ВАРШАВЕ.

ВАРШАВА, 26-2. Польскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: «Залескі даў абед румынскаму міністру замежных спраў Міранэску, які назаўчора прыехаў у Варшаву. У часе абеду Залескі ў прамове, між іншым, зазначыў: «Тая акалічнасьць, што Польшча і Румынія зьяўляюцца двума бастыёнамі, найбольш высунутымі на ўсход, а таксама маюць аднолькавую лацінскую культуру, стварае між імі самую моцную сувязь, якая злучае іх». У адказ на гэта Міранэску заявіў: «Польска-румынскі саюз трымаецца на прынцыпах захаваньня спакою на аснове сучасных угавораў, выкананьне якіх зьяўляецца адзінай моцнай гарантыяй спакою».

ПАДЗЕІ Ў ПЭЙПІНЕ.

5-ЦІТЫСЯЧНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ.

ПЭЙПІН, 25-2. Учора ў Пэйпіне панавала нязвычайнае ўзрушэньне ў зьвязку з забаронаю масавага мітынгу, скліканага ў цэнтральным парку. Блізка 5-ці тысяч дэманстрантаў накіраваліся з цэнтральнага парку ў заходнюю частку гораду і правялі масавы мітынг перад будынкам мясцовага камітэту Гаміньдану. Мітынг ухваліў рэзалюцыю, у якой просіць нацыянальны ўрад пакараць Чан-Чы (старшыня пэйпінскага аддзелу палітычнае рады) і рэктара пэйпінскага універсытэту Лі-Цьзсіна, адказных за нядаўнюю стычку між студэнтамі і паліцыяй. Далей у рэзалюцыі выказваецца просьба да нанкінскага ўраду вярнуць назад Кітаю дыплёматычны квартал і забараніць кітайцам працу ў дыплёматычным кварталe. Мітынг пратэстуе проці назначэньня дэлегатаў 3-га зьезду Гаміньдану цэнтральным камітэтам.

Пасьля мітынгу дэманстранты наладзілі працэсію па галоўных вуліцах гораду з лёзунгамі—„Прэч Чан-Чы», «Прэч імпэрыялізм і ніяроўныя ўгаворы», «Вярнеце дыплёматычны квартал Кітаю" і інш. Каля цэнтральнага парку працэсія стыкнулася з узброеным урадавым атрадам. Гэта выклікала перапуд, аднак, ніякіх стычак ня здарылася, бо дэманстранты мірна разышліся.

АНТЫЯПОНСКІ МІТЫНГ.

ПЭЙПІН, 25-2. Газэта «Сін-Чэн-Бао паведамляе, што ўчора ў Цян цзыне адбыўся антыяпонскі мітынг, у якім удзельнічала больш тысячы чалавек. Ухвалена рэзалюцыя, у якой мітынг патрабуе гласна праводзіць кітайска-японскія перамовы.

СТАЧКА ПАЛІЦЭЙСКІХ У СЭНТЛЬМЭНЦЕ ПЭЙПІНУ.

ПЭЙПІН, 20-11. Распачалася забастоўка кітайскіх паліцэйскіх у дыплёматычным кварталe Пэйпіну.

Кіруючыя органы кітайскае прэсы Пэйпіну становяцца на бок бастуючых. Газэта „Цзэін-Бао" адзначае, што кітайскія паліцэйскія дыплёматычнага кварталу атрымліваюць мізэрную пэнсію—10 кітайскіх даляраў (10 рублёў) у месяц—і што з імі абыходзяцца, як з нявольнікамі.

Бастуючыя паліцэйскія патрабуюць звольніць начальніка варты Тызе, вядомага сваімі выверскімі абыходзінамі з падначаленымі, вярнуць назад двух нядаўна звольненых паліцэйскіх.

Дэпралетарызацыя яўрэйскіх рабочых у Палестыне.

Маскоўская яўрэйская газэта „Эмэс" піша, што сіёнісцкая прэса паведамляе аб новым зьявішчы ў Палестыне: там адбываецца працэс дэпралетарызацыі яўрэйскіх рабочых. Становішча хранічнага беспрацоўя, голад і праца пры цяжкіх умовах прымушаюць рабочых шукаць больш лёгкіх заробткаў у форме дробнага гандлю і г. д. Колькасьць яўрэйскіх рабочых Палестыны такім парадкам зьмяншаецца.

Ратыфікацыя пакту Келёга Ірляндыяй.

ЛЁНДАН, 22-2. Парлямант Ірляндыі ратыфікаваў пакт Келёга 83-ма галасамі проці 50-ці.

Паркер Гільбэрт выехаў у Бэрлін.

ПАРЫЖ, 25-2. Генэральны агент па рэпарацыях Паркер Гільбэрт выехаў з Парыжу ў Бэрлін.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

ПАСЫЎНАСЬЦЬ ГАНДЛЁВАГА БАЛЯНСУ РАСЬЦЕ.

ВАРШАВА, 25-2. Дэфіцыт гандлёвага балянсу Польшчы за студзень складае 78 мільёнаў злотых. У параўнаньні з папярэднім месяцам, дэфіцыт павялічыўся на 49 мільёнаў злотых.

* * *

Згодна з аблічэньнямі статыстычнай управы гандлёвы балянс Польшчы за студзень м-ц г. г. прадстаўляецца так: экспарт 1.528.567 тонаў, вартасьцю — 215.834.000 злотых. Імпарт—437.658 тонаў, вартасьцю—294.042.000 зл.

Дэфіцыт гандлёвага балянсу ў студзені раўняецца 78.208.000 злотых.

Арышты сярод камуністаў у Варшаве.

«Кур'ер Варшаўскі» (№ 51) паведамляе аб арыштах у Варшаве шэрагу камуністаў. Між іншым арыштаваны: П. Фірстэнбэрг, Г. Гасіор, А. Пляценка, брат і сястра Корвалі, Ш. Бурштын, Х. Глязэр, І. Гэйзінгэр, Ш. Гагэндорф і М. Грабэ.

Канфіскацыя „Газэты Варшавскай".

Урадавы камісарыят г. Варшавы сканфіскаваў № 50 «Газэты Варшавскай» за 20 лютага г. г. за зьмяшчэньне артыкулаў пад назвай: „Праследаваньне моладзі" і «Сапраўдная прычына роспуску Сілезскага сойму».

Ваяводы ў Варшаве.

«Кур'ер Віл.» (№ 43) паведамляе, што ў Варшаву гэтымі днямі прыбыло, некалькі ваяводаў. Між іншым прыбылі віленскі ваявода Рачкевіч і беластоцкі—Кірст. „Прыезд ваяводаў,—кажа «К. В.»,—знаходзіцца ў сувязі з сітуацыяй, якая вытварылася з прычыны катастрафальных маразоў і сьнежных завеяў". А ці не знаходзіцца прыезд ваяводаў у Варшаву ў сувязі з цэлым шэрагам палітычных працэсаў, якія набліжаюцца ў Зах. Беларусі. Хутчэй, што так.

Імяніны пана Пілсудзкага.

Кожны год, калі збліжаецца час імянін пана Пілсудзкага, сферы, якія адыгрываюць цяпер у Польшчы выдатную ролю, вельмі стараюцца ўзнаваць імяніны свайго шэфа і да рэзты імкнуцца выхваляць яго. Утварэньнем камітэты, якія складаюцца з услужачых падпазаў, так ці іначай выкарыстоўваючых сваё становішча для ўласных мэт. Такога зьявішча ня можна было нагляджаць нават у царскія часы.

Вялікі крадзеж—на 100 тыс. зл.

На галоўным вакзале ў Варшаве выкрыты вялікі крадзеж мэблю на суму 100 тысяч злотых. Аказалася, што крадзеж зроблен в вагону спосабам выняцця плёмбы і замкаваньня не пашкаваньня.

Канфіскацыя „Дзеньніка Цешынскага".

Шосты раз сканфіскавана газэта «Дзеньнік Цешынскі» за перадрук артыкулу Сялецтахоўскага, а таксама за перадрук заметкі „Роботніка" пад назвай „Фродро, Марцінэўскі і Пілсудзкі".

У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Яўрэйскія настаўнікі пагражаюць забастоўкай.

Саюз настаўнікаў гэбрэйскіх і яўрэйскіх школ у Вільні прыслаў ў яўрэйскую гміну ультыматум, у якім пагражае ўсеагульнай забастоўкай, калі ня будзе выплачана асыгнаваная субсідыя ў разьмеры 50 тыс. злотых.

Забастоўка ў прытулку.

Гэтымі днямі ў прытулку імя Г. Маркс у Вільні выбухла забастоўка службовага пэрсаналю. Прычынай забастоўкі зьяўляецца нявыплата служачым пэнсіі.

Перад выбарамі ў Баранавіцкі магістрат.

У галоўну выбарчы камітэт у Баранавічах паданы аж 21 выбарчы сьпісак. Сярод сьпіскаў—11 яўрэйскіх, 8—польскіх, 1-беларускі і 1 праваслаўны.

Голад.

У некаторых мясцовасьцях Заходняй Беларусі мінулым летам быў неўраджай і цяпер гэтыя мясцовасьці знаходзяцца пад пагрозай голаду. Нядаўна віленскі ваявода Рачкевіч у часе свайго пабыту ў Варшаве накіраваў з міністрам працы і грамадзкай апекі ў справе дапамогі неўраджайным мясцовасьцям.

Пастаноўлена асыгнаваць на гэтую мэту ам 1.500.000 польскіх злотых.

Новы прэзыдыум Бел. Інст. Гаспадаркі і Культуры.

На апошнім пасяджэньні Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ў Вільні выбран новы прэзыдыум Інстытуту ў складзе: старшыня—кс. Гадлеўскі, віцэ-старшыня—пасол сойму Стэповіч і інш. Кіямовіч, сэкратар—Позьняк, скарбнік— Сьвістун, сябры—Каруза і Васілеўскі. Рэвізійная камісія—кс. Станкевіч, пасол Яромін, Будзька і сэн. Багдановіч.

Беспрацоўе ў Вільні.

Паводле статыстычных даных лік беспрацоўных у Вільні павялічыўся ў параўнаньні з мінулым тыднем на 35 асоб і дасягнуў 4586 асоб, у тым ліку—3425 мужчын і 1161 жанчына.

У ЛІТВЕ.

Суровыя рэпрэсіі проці вучняў.

«Слово» (№ 45) паведамляе, што па загаду дырэктара кавенскай школы мастацтва з старшай клясы звольнена 35 слухачоў (застаўся адзін) за тое, што яны падалі міністру асьветы скаргу на дырэктара за ігнараваньне ім школьных спраў. У сувязі з гэтым слухачы школы склікалі агульны сход, на якім пастанавілі падаць Вальдэмарасу заяву аб асабістым разглядзе гэтай справы. Як пратэст, сход пастанавіў не хадзіць на заняткі ў працягу аднаго тыдню.

Ратыфікацыя літоўска-нямецкай гандлёвай умовы.

Літоўскі габінэт міністраў на 15 лютага г. г. пастанавіў ратыфікаваць літоўска-нямецкі гандлёвы трактат.

Пакараньне рэдактара „Рытаса".

«Слово» (№ 45) паведамляе, што на загаду камэнданта Коўні рэдактар газэты „Рытас" за распаўсюджаньне фальшывых пагалосак пакараны штрафам у разьмеры 500 літаў з заменай на 1 месяц арышту.

Нямеччына зафрахтоўвае 2 сав. лёдаколы

БЭРЛІН, 25-2. Агенцтва Вольфа паведамляе: «У Кіелі адбылася нарада прадстаўнікоў міністэрства шляхаў, марскога ведамства і саюзу нямецкіх судналёсапрамыкаў. Нарада ўхваліла зафрахтаваць 2 самых буйных савецкіх лёдаколы «Ярмара» і «Трувар», каб паспрабаваць здымець, на магчымасьці, для зносін канал Вэзэр-Эльба і праклясьці фарватэр у заходняй частцы Балтыцкага мора».

Зьдзекі перамогшага фашызму.

Пасьля доўгіх хістаньняў, унутраных сварак, склокі і ўзаемных крыўд беспартыйны блёк супрацоўніцтва з урадам распрацаваў і ўцёр, нарэшце, у сойм праект перагляду польскай канстытуцыі.

Старая так званая сакавіковая канстытуцыя 1921 г. была сфабрыкавана пад уплывам двух галоўных фактараў: шалёнага страху польскай буржуазіі перад рэвалюцыяй і жаданьня зьменшыць уплыў тагочаснага дыктатара Пілсудзкага, якому ў тыя часы польская буржуазія яшчэ не даняла. Вось чаму сакавіковая канстытуцыя была ўтворана па ўзору «ялікіх эўрапейскіх дэмакратый», з усім арсэналам дэмакратычнай і ліберальнай фразэлёгіі. У аснове старой канстытуцыі ляжыць пацьвярджэньне ўлады на выканаўчую (прэзыдэнт і габінэт міністраў), законадаўчую (сойм і сэнат) і судовую, прычым мелася, зразумела, на ўвазе, што суд будзе незалежны ад ураду. Канстытуцыя не прадастаўляла прэзыдэнту ніякай фактычнай улады. Урад цалкам залежаў ад парламэнту, які зьяўляўся фактычнаю законадаўчаю і кантралюючаю ўладаю.

Восем год існаваньня сойму і старой канстытуцыі ў дастатковай меры давялі народным масам, што ніводная з свабод, гарантаваных канстытуцыяй, ня была фактычна праведзена ў жыцьцё. Замест свабоды нацыянальнага развіцьця Польшча зрабілася турмой для насяляючых яе народаў. Замест гарантаванай свабоды сумленьня рабочыя масы атрымалі бізун, штык, кулю і перапоўненыя палітзьняволенымі турмы. Гарантаваны на паперы 8-гадзінны рабочы дзень аказаўся фікцыяй, бо голад і тэрор прымушаюць рабочых працаваць па 12, а часта і па 16 гадзін у дзень, як, напрыклад, у Лодзі. Парлямант стаў месцам найбруднейшых палітычных закулісных махінацый. Выбары праводзіліся пры дапамозе тэрору і подкупу. Масы не адчувалі ніякіх канстытуцыйных свабод.

Праўда, на гледзячы на тэрор і ўсе скарпіёны, рэвалюцыйным рабочым і сялянам, а часткова і нацыянальшасьцям усё-ж удавалася правяціць у сойм мінімальную колькасьць сваіх прадстаўнікоў, якія атрымалі магчымасьць паведаміць увесь сьвет з парляманцкай трыбуны аб праўдзе, аб убостве і эксплёатацыі рабочых мас, аб горкай долі пянаючага вялікі сялянства, аб паліцэйскім тэроры ў акупаваныхваласьцях. Але закон аб дэмакратычных свабодах пісаны не для прадстаўнікоў рэвалюцыйных рабочых і сялян. Ня гледзячы на ўсякія законы аб дэпутацкай недатыкальнасьці, польская буржуазія здолела справіцца з дэпутатамі-рэвалюцыянэрамі. Беларускага дэпутата Барана па руках вынесьлі з сойму і пасадзілі ў турму. Быў кінуты за краты тройка польскіх сялянскіх мас— Домбаль. Папаў у турму гордасьць рабочай клясы Польшчы—чыгуначнік Ланцуцкі. Правакацыя прымусіла ўцячы з межаў Польшчы дэпутата Крулікоўскага. Папалі ў турму дэпутаты-рэвалюцыянэры Беларускай Грамады—Тарашкевіч, Мятла, Рак-Міхайлоўскі і Валошын, а таксама дэпутат незалежнай сялянскай партыі Галавач. Рэшта дэпутатаў гэтай партыі—Ваяводскі і Балін уцякі за межы. Уцёк напярэдадні арышту дэпутат камуністычнай фракцыі Сахацкі. Не пасьпеў уцячы і папаў у турму камуністычны дэпутат—гарняк Дамброўскага райёну Бачынскі.

Так выглядалі на практыцы парляментарызм і дэмакратычныя свабоды ў Польшчы да фашысцкага пераварота Пілсудзкага.

Больш двух год кіруе краінай пілсудчына. Краіна цьвёрда пераведзена на фашысцкія рэйкі. Парлямант зрабіўся цацкаю ў руках фактычнага дыктатара Пілсудзкага, які бязупынна зьдзекуецца над ім. Чаго варта адна мінулагодняя ліпнёўская гутарка, у якой Пілсудзкі проста назваў сойм „вборыячам шлюх" (дасюлёна). Уся ўлада сканцэнтравана ў руках дыктатара. Вакол яго згрупаваны самыя рэакцыйныя элемэнты з польскіх абшарнікаў і капіталістаў. Фашызм і адзінаасобная дыктатура адкрыта сьвяткуе перамогу, груба папіраючы бяз усякага прыкрыцьця ўсе ілюзіі парляманцкага і дэмакратыі.

Зараз пілсудчыкі рашылі, што надышоў момант узаконіць фактычнае становішча рэчаў. Пілсудзкі рашыў даць краіне новы прававарадак і прадыктаваў праз сваіх падручных з беспартыйнага блёку новую канстытуцыю.

Няма чаго асабліва ўдумвацца і ўчытвацца ў новую канстытуцыю. Яна ня столькі вынік юрыдычных хітраспляценьняў, колькі дакумант фашысцкага цынізму і салдафонскай грубасьці. Яна ўзаконе ўсё тое, што да гэтага часу рабілася Пілсудзкім супроць закону. Уся ўлада пераходзіць у рукі прэзыдэнта, якому прысвайваецца ўлада абсалютнага манарха. Сойм застаецца толькі для віду—ён фактычна ня мае ніякага значэньня. Мала таго, што прэзыдэнту надаецца права ў любы момант зачыніць, адтэрміноваць ці наогул распусьціць сойм, яму таксама прадастаўлена права апрацэставаць любую пастанову сойму. Больш таго, кожны дэпутат можа быць пасаджан у турму, калі ў яго словах будзе знойдзена парушэньне дэпутацкай прысягі ці хоць-бы замах на «годнасьць сойму». За любую прамову, якую міністр юстыцыі прызнае „нягоднай" сойму, дэпутат бяз усякіх фармальнасьцяй можа быць пазбаўлен мандату і пасаджан у турму.

У друку і ў палітычных колах шмат гавораць аб будучай барацьбе ў абарону дэмакратыі і старой канстытуцыі.

Сапраўды, знаміся абаронцы парлямантарызму і з правага і з левага боку. Нацыянальная дэмакратыя, пабаяўшыся ў маі 1926 году пілсудч

У Саюзе ССР.

Вапнаваньне глебы ў БССР.

На працягу бягучага году ўхвалена завапнаваць абшар у 25.000 гэктараў.

Пастанова сел.-гасп. сэкцыі ўрадавага камітэту хімізацыі СССР.

МАСКВА, 26-2. Сельска-гаспадарчая сэкцыя ўрадавага камітэту хімізацыі СССР у пастанове па дакладу Савіцкага (прад Наркамзему БССР) прызнае, што вапнаваньне глеб у Беларусі павінна праводзіцца ўжо ў бягучым годзе не ў выглядзе спробы, як прапануе Наркамзем БССР, а ЯК ШЫРОКАЕ ПРАКТЫЧНАЕ МЕРАПРЫЁМСТВА. З гэтае прычыны заместа намечаных НКЗ БССР 5 000 гэктараў ПАВІННА БЫЦЬ ЗАВАПНАВАНА Ў БЯГУЧЫМ ГОДЗЕ 25 000 ГЭКТАРАЎ, З ЯКІХ 5.000 ЛЕТАМ, А 20.000 ВОСЕНЬЮ.

НКЗ БССР запрапанавана тэрмінова хадайнічаць перад Эканамічнай Нарадай рэспублікі аб пераглядзе крэдытнага пляну Белсельгасбанку ў бягучым годзе з тым, каб забясьпечыць водпуск на меней 7000 тысяч руб. на крэдытаваньне апэрацый па вапнаваньню.

У пляне Наркамзему па фінансаваньню вапнаваньня неабходна прадугледзець асобныя сродкі на навукова-дасьледчую працу ў гэтай галіне.

У БЕЛАРУСЬ ПРЫЕДЗЕ АМЭРЫКАНСКАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ РАБОЧЫХ-ЯЎРЭЯЎ.

ДЭЛЕГАТЫ Ў ЗАХАПЛЕНЬНІ АД РАЗМАХУ І ПОСЬПЕХАЎ КУЛЬТУРНАГА БУДАЎНІЦТВА У СССР.

(З Масквы ад уласнага карэспандэнта).

У Маскву вернулася амэрыканская яўрэйская рабочая дэлегацыя пасьля падарожжа па Украіне, дзе яна наведала некалькі гарадоў, старыя і новыя яўрэйскія калёніі. Гаворачы аб сваіх ўражаньнях, дэлегаты заявілі: «Усюды адчуваецца вопытная рабочая рука, якая ведае, як упарадкаваць штодзённыя жыцьцёвыя пытаньні, як іх вырашаць. Асабліва вялікае ўражаньне зрабіла на дэлегацыю савецкая праца ў галіне культурнага будаўніцтва. У гарадох Украіны мы бачылі такі разгалінены апарат культурнага абслугоўваньня, столькі дасягненьняў у гэтай галіне, што ніхто з нас раней ня мог сабе гэтага ўявіць».

«На Украіне,—кажуць далей дэлегаты,—мы добра азнаёміліся з абслугоўваньнем нацыянальных меншасьцяў д яржаўным апаратам. Кожны, хто цікавіцца тым, як можна правільна вырашыць нацыянальнае пытаньне, можа знайсьці самы лепшы ўзор гэтага ў Савецкім Саюзе».

Дэлегаты выказалі сваё здавольненьне падарожжам, увагай, якую ім аказвалі, шчырасьцю, з якой іх сустракала рабочая грамадзкасьць. Гутарка з яўрэйскімі земляробамі ў Херсонскіх яўрэйскіх калёніях дала ім поўнае ўяўленьне аб посьпехах яўрэйскага земляробства ў СССР.

У нанач тыдню дэлегаты выязджаюць у Ленінград, а потым паедуць на Беларусь, дзе наведаюць Гомель і Менск.

Дэлегацыя маскоўскіх рабочых у НКФ.

НАЙВЫШЭЙШЫ ОРГАН ФІНАНСАВАЕ ПАЛІТЫКІ СССР АДЧЫТВАЕЦЦА ПЕРАД РАДАВОЮ РАБОЧАЮ МАСАЮ.

МАСКВА. 25-га лютага рабочая дэлегацыя з прадстаўнікоў буйных фабрык і заводаў Масквы наведала Наркамфін СССР і была сустрэчана нарконам Бруханавым і адказнымі працаўнікамі наркамату. Бруханаў зрабіў дакład аб крэдытнай сыстэме СССР, аб значэньні пазык і кас ашчаднасьці для народнае гаспадаркі, а таксама аб структуры Наркамфіну і асобных частак яго, аб складзе супрацоўнікаў і г. д. На запытаньне, колькі каштуе генэральны апарат Наркамфіну, Бруханаў адказаў, што ў даваенны час міністэрства фінансаў, дзе было 1.535 чыноўнікаў, каштавала блізка 4.250.000 рублёў. З гады назад у Наркамфіне таксама было блізка што паўтары тысячы служачых, але зараз працуе толькі 830 чалавек. Цэнтральны апарат Наркамфіну каштуе блізка 3-х мільёнаў рублёў.

Бруханаў адказаў таксама падрабязна на запытаньні аб пакупной вартасьці рубля, аб новым сельска-гаспадарчым падатку, аб здобычу золата ў СССР, аб экспарце і імпарце. Рабочыя выказалі пажаданьне яшчэ раз прыйсьці ў Наркамфін, каб выказаць свае думкі пакоп працы Наркамфіну.

ЎДАРЫЦЬ ПА ПРАГУЛАХ ЗАКОНАДАЎЧЫМІ МЕРАМІ.

(Даклад прадстаўніка Донвугалю ва ўрадавай камісіі)

МАСКВА. 25-га лютага ўрадавая камісія па ўзьняцьці працоўнае дысцыпліны абмяркоўвала пытаньне пакоп стану працоўнае дысцыпліны на прадпрыемствах Донвугалю. З дакладу прадстаўніка тросту Донвугалю тав. Юнава вынікла, што вытворчая праграма здобычу вугалю ў першым квартале сёлетняга году ня выканана і дасягае толькі 96 проц. пляну. Поруч з гэтым конт рабочае сілы дасягнуў 105 проц., а агульны сабекошт прадукцыі—103 проц. пляну. Невыкананьне вытворчае праграмы Донвугалю тлумачыцца розными прычынамі, у тым ліку, і зьніжэньнем працоўнае дысцыпліны на вытворчасьці. Працоўная дысцыпліна парушаецца, пераважна, прышлымі вясковымі гушчамі рабочых. Поруч з узмацненьнем выхаваўчае працы для ўзьняцьця працоўнае дысцыпліны, на думку праўленьня Донвугалю, трэба згадзіцца на некаторую зьмену працоўнага законадаўніцтва ў бок барацьбы з прагуламі і прастоямі.

Баявы падарунак Чырвонай армії.

ВАРОНЕЖ, 24-га лютага ў Варонежы адбылася ўрачыстая перадача Чырвонай армії трох самалётаў, пабудаваных на сродкі, сабраныя працаўнікамі спажывецкае каапэрацыі.

Хабарнікі з канцсэйнага заводу „Тигли Моргана".

ЛЕНІНГРАД, 22-2. У ленінградскім акруговым судзе расчаўся разгляд справы па абвінавачаньні кіраўніка канцсэйнага заводам «Тигли Моргана» латвійскага грамадзяніна Яна Вольфмана ў дачы хабарою за распаўсюджаньне прадукцыі гэтага заводу.

На тыглях, выпрацоўваемых на канцсэйным заводзе, а таксама на тыглях імпортных, якія атрымліваліся з лёнданскага заводу Моргава, ставілася адна і тая-ж марка «Морган», і яны ішлі на Урал, Сібір, на паўднёвыя заводы і ў інш. месцы. Гэтыя тыглі неабходны пры апрацоўцы каляровых металаў.

Адпак канцсэйныя тыглі ня вытрымлівалі пакладзенага ім ліку плавак і хутка зношваліся. Выпісваемыя „Госпромиметом" тыглі Моргана непасрэдна з Лёндану па якасьці былі куды лепшыя, чымся вырабленыя на ленінградскай канцсэйнай фабрыцы. Калі ленінградскія канцсэйныя тыглі па сваёй якасьці былі ўзяты пад падазронасьць, дык Вольфман пакіраваўся на Кальчугінскі завод, які скардзіўся на кепскую якасьць тыгляў, і даў хабар інжынеру-хіміку Брынкіну. Да крымінальнае адказнасьці, апрача Вольфмана, Брынкіна і дзіціка Галавога, прыцягнуты таксама прадстаўнік фірмы у Тульскім райёне і загадчык літвым цэхам Кальчугінскага заводу Лук'яваў.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Наладзілі рабочае шэфства.

ГОМЕЛЬ, 26-2. 24-га лютага ў Гомель спэцыяльным поездам прыехалі 800 рабочых Дабрускае фабрыкі «Гэрой Працы». Партыйна-прафэсыянальна-савецкія арганізацыі наладзілі ўрачыстае спатканьне. На вакзале адбыўся лятучы мітынг, на якім з прывітаньнем выступіў старшыня акрвыканкому.

Потым рабочыя стройнымі шэрагамі накіраваліся ў казармы Н-й часьці і падрабязна знаёміліся з бытам чырвонаармейцаў. У казарме зноў быў наладжан мітынг, на якім выступілі прадстаўнікі арганізацый, вайсковых часьцей і рабочых фабрыкі.

Рабочыя прынялі шэфства над гэтай вайсковай часьцю. Пасьля агляду казармаў рабочыя наведалі Беларускі тэатр і ўзялі ўдзел у ўрачыстых провадах тэатру.

ГАСПАДАРЧЫЯ І КУЛЬТУРН. ПЫТАНЬНІ Ў ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

(Ліст з Гомелю).

22-га лютага ў Гомелі адчыніўся чарговы пленум акрвыканкому. У парадку дню пытаньні вясеньняй пасеўной кампаніі, ліквідацыя напісьменнасьці, спагнаньне завінавачанасьці і інш.

Асабліва дзелавой крытыцы пленуму падпаў даклад прэзыдыуму акрвыканкому. У спрэчках шмат гаварылі аб неабходнасьці падрыхтоўкі савецкага нізавога апарату. Усе старшыні РВК прапанавалі арганізаваць курсы для працаўнікоў сельсаветаў. Шмат гаварылі аб рацыяналізацыі працы савецкага апарату. Як і раней вышэйстаячыя арганізацыі патрабуюць ад райёнаў сводак - разьмерам каля 2 мэтраў ці вагой каля 5 кілёграм.

У райёны пасылаюцца розныя арганізацыі аднолькавыя абежнікі. Так напрыклад, акрзямаддзел, налітсьветы, ТДА-Авіяхім прысылаі тыя-ж самыя пляны па правядзеньні вясеньняй пасеўной кампаніі.

Часта ў райёны пасылаюць абежнікі, якія каб прачытаць трэба мабілізаваць увесь апарат райвыканкомаў.

Скардзіліся на пленуме, што ў сялішчах лекавыя ўстановы на маюць дактароў. Няма адпаведных спэцыялістаў у райёнах. Між тым, на вучоце Біржы Працы лічацца бесправоўныя спэцыялісты, але апошнія адмаўляюцца ад паездкі ў вёску. У паасобных райёнах пакража лесу павялічваецца. Змаганьне з лесапарубшчыкамі правадзіцца слаба. У Веткаўскім, Брагінскім, Камарынскім, Хойніцкім райёнах павялічваецца спэкуляцыя хлебам.

Паўтораны памылкі з загатоўкай дравіны для школ. Апошнія аналізуюцца сырымі дровамі. У паасобных райёнах дзякуючы гэтаму школы не працуюць. Гаварылі шмат аб скажэньні класавай лініі ў прадстаўленьні крэдытаў.

Наогул, пленум адзначыў шэраг недахопаў, якія павінны быць у бліжэйшы час зьнішчаны.

Н. В.

ДЗЯЛЬЦЫ БАРЫСАЎСКАГА БЕЛКААПСАЮЗУ.

(Ліст з Барысава).

Калі летась загатоўчыя арганізацыі БССР вялі паміж сабою шалёную канкурэнцыю, калі на рынку ўтвараўся ажыятаж, і цэны злачынна парушаліся, дык у Белкаапсаюзе была «тишь и божья благодать»...

—Мы ніколі не парушаем цэн,мы сурована прытрымліваемся дырэктыў рэгулюючых органоў—гаварылі белкаапсаюзаўцы, гэта іншыя парушаюць, іншыя пераплачваюць, мы—самыя акуратныя і сумленныя людзі...

І РСІ, якая летась абсьледавала загатоўчыя арганізацыі, таксама, нібы прышла да заключэньня, што ў Белкаапсаюзе „ў агульным і цэлым" усё добра...

Але гэта хутка было парушана.

Гэта было ў лістападзе месяцы, калі загадчык Барысаўскім складам Белкаапсаюзу т. Дворын здаваў склад новаазначанаму загадчыку т. Руцкому. Пры прыёмцы тавараў быў выкрыт недахоп у 13000 руб. Пачалося хваляваньне, пачалі шукаць, і знайшлі, што 5000 р. трэба сьпісаць за... нягодны тавар, а на 8000 р. маюцца пераплаты.

Што рабіць, як выратаваць становішча, сумленнае імя Белкаапсаюзу будзе асаромлена. Думалі, думалі, заклікалі на дапамогу старшыню рэвізійнае камісіі Барысаўскага Белкаапсаюзу, і... склалі два акты, што ўсё добра, чыстна і хораша... а другі, што з прычыны пераплат не хапае... 8.000 руб.

Зроблена, публіка павесялела, што спакой Белкаапсаюзу ня будзе парушан...

Але не надоўга... Аб гэтым нейкім цудам даведалася Барысаўская РСІ і запрапанавала звольніць з працы загадчыка Барысаўскім адзяленьнем Белкаапсаюзу т. Ігнатовіча, яго «прыяцеля» тав. Дворына, а таксама незаменнага іх сяўца тав. Голасоўкера. Уся гэта дружная кампанія прымушана была пакінуць сваё цёплае мястэчка.

Ну, а старшыня рэв. камісіі тав. Ганс, што ён скажа, як-жа ён падпісаў два акты... Аб гэтым нешта маўчаць, бо нейк «няёмка» прыцягнуць яго да адказнасьці за два подпісы...

А праўленьне Белкаапсаюзу пакуль маўчыць, яно ўжо не гаворыць гучна аб сваёй „сумленнасьці і акуратнасьці" ў адносінах пераплат.

Але гэтага мала. Неабходна гэтую справу расьсьледаваць. Нарушыцелі цэн, утойвацелі павінны быць пакараны, павінны стаць перад пралетарскім судом.

Стрэлачнік.

Дзесяткі тысяч рублёў запазычанасьці.

(Ліст з Мазыру).

Сэкцыяй РСІ Мазырскага Га савету па даручэньні прэзыдыуму была праведзена праверка запазычанасьці па авансах усім установам, падпарадкаваным Гарсавету.

Цёмна ў вачох робіцца, калі паглядзіш запазычанасьць па Гаркамгасу у 15.358 р. 44 к. Сума немаленькая і цікава паглядзець за кім яна лічыцца.

За былым загадчыкам Гаркамгасу 94 р. 67 к., за былым тэхнікам Хлябцэвічам (які даўно памёр) 115 руб., за адказным Гомельскага райспажыўсаюзу 6735 р. 84 к., за Пятрыкоўскім РВК 664 р. з 1926 г., за іншымі РВК 891 р. 29 к. з 1926 г. за розны матар'ял і пажарныя машыны.

Вялікая запазычанасьць лічыцца за акруговым інжынэрам Сібользі у суме 3606 р. 93 к. і ніякіх адпаведных дакумэнтаў ён не прадстаўляе.

На кіраўніцтву працалектывамі лічыцца запазычанасьць з лістапада м-ца ў колькасьці 411 р. 70 к. На ЦРК за супрацоўнікамі 389 р. 54 к.

Прэзыдыум гарсавету прапанаваў усім установам ліквідаваць запазычанасьць.

Яўхім.

Рыхтуемся да райённых зьездаў саветаў.

Гомель, 26-II. Райвыканкомы пачалі падрыхтоўку правядзеньня райённых сходаў саветаў.

У Гомельскім, Рэчыцкім, Веткаўскім і Ўваравіцкім райёнах на зьездах саветаў будуць даклады ўраду БССР.

Абозы з хлебам у Клімаўшчыне.

На днях у гор. Клімавічы арганізавана з чырвонымі сьцягамі прыбыло яшчэ 2 чырвоныя абозы з хлебам ад грамадзян в. в. Аўтухоўкі, Ціманава і Балешына. У абозах налічвалася да 50 фурманак з хлебам—каля 450 пудоў.

Урачыстая сустрэча з музыкай чырвоных абозаў адбылася на Базарнай плошчы каля загатоўчых складаў Саюзхлеба.

У адказ на прывітаньні прадстаўнікоў райкому КП(б)Б і РВК сяляне заявілі: «Мы—сяляне ўлічваем цяжкасьці савецкага ўраду ў пабудове сацыялізму, здаём усе свае лішкі хлеба дзяржаве і ніводнага фунта спэкулянтам».

Здатчыкі хлеба адзінагалосна выклікаюць пасьледаваць іх прыкладу ўсе сельсаветы Клімаўшчыны і астатнія райёны акругі.

За 20-22 лютага ўсяго прыбыло тры чырвоныя абозы і здана хлеба на склады Саюзхлеба да 600 пудоў. Заўважана шмат выпадкаў, калі прысутнічаючыя сяляне з іншых вёсак запрашаюць РВК накіраваць да іх прадстаўнікоў да арганізацыі чырвоных абозаў. Есьць чуткі, што ў іншых вёсках райёну таксама рыхтуюцца чырвоныя абозы.

Асмалоўскі.

Хто за Вушачамі?

Ашчадная справа на Вушаччыне (Полаччына) да гэтага часу была ў загоне. Мясцовыя арганізацыі лічылі ашчадную справу вузка-паштовай справай.

— Што грэх таіць, ня лічыліся мы з гэтай вялізарнай работай,—прызнаецца адкрыта сакратар райкому.

... Сход канстатуе,—гаворыцца ў рэзалюцыі міжсаюзнага сходу,—што ашчадная справа ў нашым р-не ня мела посьпехаў дзякуючы недастатковай увазе з боку мясцовых арганізацый, у тым ліку з боку прафсаюзаў...

Гэта-ж падкрэсьліваюць і лічбы. Калі на 1-Х—28 г. мелася па р-ну 147 укладчыкаў з сумай укладаў 10252 р., дык на 1-П г. г. 160 укладчыкаў і 5552 р. укладаў.

План 1927-28 г. выканан па ўкладчыках на 15,3 проц. па ўкладах 41,4 проц. Шмат хто з вушацкіх сялян і нават з служачых ня ведаюць нічога аб ашчаднай касе. Камісія садзейнічаньня пры РВК і с-с бязьдзейнічалі, іх працай ніхто ніколі ня цікавіўся.

Падрыхтоўка да двухтыднёвіка, які пачынаецца 1-Ш, распачалася толькі з прыездам прадстаўніка акругі.

Лістаносец Лаздін праз 2 дні завербаваў ужо 12 укладчыкаў з сумай 254 р. 50 к.

— Думаю 60 чалавек уцягнуць,—кажа ён.

Пры сельсаветах распачалі працу камісіі садзейнічаньня.

Саюзы і камсамол арганізуюць „брыгады ашчаднасьці", якія будуць накіраваны для працы па вёсках.

Наогул падрыхтоўка прахоўзіць добра. Усюды адчуваецца актыўнасьць. Трэба сказаць, што Вушацкі р-н па падрыхтоўцы стаіць на першым месцы на Полаччыне.

Хто за Вушачамі?

Мік. С.

М. Вушачы, Полаччына.

На прадпрыёмствы пасылаюцца новыя рабочыя.

Гомель, 26-2. Лік рабочых на фабрыцы «Днепр» павялічваецца. Учора біржа працы накіравала на працу на фабрыку 56 беспрацоўных жанчын.

Апошнія ў працягу першых двох месяцаў будуць навучацца, а потым увойдуць у штат рабочых. Страхкаса і саюзныя арганізацыі аказваюць грашовую дапамогу пасланым работніцам.

ПЕРШЫ УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД ЖАНЧЫН КААПЭРАЦЫЙНАГА АКТЫВУ.

25 лютага ў Цэнтральным Доме Селяніна адчыніўся І Усебеларускі зьезд жанчын каапэрацыйнага актыву спажывецкай каапэрацыі БССР. З усіх куткоў Беларусі на зьезд прыехала звыш 00 дэлегатак, з якіх 65 работніцы, а рэшта—сялянкі.

— Сёньняшні дзень,—кажа старшыня праўленьня Белкаансаюзу т. Наўлянскі, адчыняючы зьезд,—будзе ўпісаны ў гісторыю каапэрацыйнага руху БССР, як вялікі гістарычны дзень. Сёньня ўпяршыню за ўвесь час існаваньня каапэрацыі ў Беларусі сабраўся зьезд жанчын-каапэратараў. Фактам гэтага зьезду мы пераходзім да рэальнага ажыцьцяўленьня масавага ўцягненьня жанчын у практычную працу па будаўніцтву і кіраўніцтву каапэрацыяй.

На зьездзе вы ня толькі азнаёміцеся з агульным становішчам каапэрацыі, але і вызначыце шлях па далейшаму накіраваньню працы. Зьезд павінен будзе распрацаваць практычныя мэрапрыёмствы для ажыцьцяўленьня лёзунгаў дырэктыў партыі і ўраду па паляпшэньню жанчын да працы ў каапэрацыі. Мы павінны прапрацаваць гэта асабліва уважліва, бо ў данай галіне намі зроблена яшчэ вельмі мала.

Мы павінны паставіць лёзунгам сённяшняга дня:—ніводнага ЦРК, ні воднага спажывецкага таварыства без жанчыны ў складзе праўленьня; ня менш 30 проц. спажывецкіх таварыстваў абавязаны мець старшынёй жанчыну.

Прэзыдыум зьезду абіраецца в 2[illegible] чалавек. Пад воплескі ўсёй залі ў ганаровы прэзыдыум абіраюцца т. т. Сталін, Крупская, Арджоніка, Калінін, Гамарнік, Васілевіч, Чарвякоў, Галадзед і Рыжоў.

Далей зьезд заслухаў шэраг прывітаньняў. Гучнымі воплескамі зьезд спаткаў старшыню СНК БССР тав. Галадзеда, які перадаў прывітаньне ад імя ЦК КП(б)Б і ўраду БССР.

Ад імя цэнтрасаюзу перадала прывітаньне, прыехаўшая з Масквы т. Бутозава, ад жанадзелу ЦК КП(б)Б—т. Крэмер, ад ЦСПСБ—т. Кулак.

БЛІЖЭЙШЫЯ ЗАДАЧЫ СПАЖЫВ. КААПЭРАЦЫІ.

(Прамова старшыні СНК БССР т. Галадзеда)

Старшыня Савнаркому БССР, вітаючы зьезд ад імя ЦК КП(б)Б і ўраду БССР, зазначыў, што зьезд жаночага каапэрацыйнага актыву сабраўся ў адзін з адказных перыядаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Той факт, што ў разьвязваньні пастаўленых камуністычнай партыяй задач па перабудове і рэканструкцыі народнай гаспадаркі прымаюць самы актыўны ўдзел шырокія масы рабочых і сялян, гаворыць за тое, што з гэтымі задачамі мы справімся з посьпехам.

Каб практычна ажыцьцявіць усе ідэі, якія закладзены ў пастановах партыі, нам неабходна ўлічыць вопыт і практыку месц. Вось чаму абмен вопытам дэлегатак зьезду будзе нам вельмі карысны.

Сучасны пэрыяд характарызуецца сацыялістычнай рэканструкцыяй усёй народнай гаспадаркі, а ў тым ліку і сельскай.

Пасьля сканчэньня грамадзянскай войны нашы дасягненьні ва ўсіх галінах гаспадаркі нязьмерныя. Гэта відавочна ўсім нам, нашы посьпехі бачаць і нашы класавыя ворагі.

Сапраўды, няма ніводнага прадпрыёмства ў БССР, якое ня было-б адбудавана, якое ня было-б пераабсталявана. Мы пабудавалі і будуем шмат новых фабрык і заводаў. У сельскай гаспадарцы таксама вялікая розьніца паміж тым, што было ў 1918-20 гадох і тым, што мы маем зараз. Вы лепш нас бачыце гэтую вялікую розьніцу.

На XII зьезьдзе камуністычная партыя бальшавікоў Беларусі падагуліла ўсе вынікі гаспадарчага будаўніцтва, разам з тым XII зьезд вызначыў асноўныя шляхі і праднасьлкі для далейшага будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне.

Каапэрацыя ў сыстэме сацыялістычнага будаўніцтва адыгрывала і будзе адыгрываць вялікую ролю. Спажывецкая каапэрацыя зьяўляецца масавай арганізацыяй; яна яднае мільёны і дзесяткі мільёнаў працоўных у Саюзе. Каапэрацыя павінна адыграць асноўную ролю па аграмаджаньню нашай сельскай-гаспадаркі. Яна зьяўляецца асноўным шляхам, па якому ўсе дробныя сялянскія гаспадаркі павінны быць уцягнуты ў агульную сыстэму сацыялізму. Каапэрацыя зьяўляецца шляхам да сацыялізму—такі наказ пакінуў нам т. Ленін. Перад намі задача—гэты наказ Ільіча ажыцьцявіць.

Далей т. Галадзед спыняецца на перспэктывах разьвіцця каапэрацыі ў бліжэйшыя 5 год.

— Мы паставілі сабе задачу—за 2 гады каапэраваць сялянскую беднату на ўсе 100 проц., а за 5 год уцягнуць у каапэрацыю 90 проц. агульнага ліку ўсіх гаспадарак. Мы паставілі задачу — праз каапэрацыю мабілізаваць сродкі сялянства на перабудову сельскай гаспадаркі. Толькі на адны дзяржаўныя сродкі мы ня зможам поўнасьцю перабудаваць сельскую гаспадарку, бо гэтых сродкаў замала. Трэба, каб сялянства свае сродкі ўкладвала ў вытворчасьць сельскай гаспадаркі, каб падняць яе на больш высокую культурную ступень. Ваша задача, задача актывістых каапэрацыі—мабілізаваць сродкі насельніцтва праз павышэньне капіталы, праз пашырэньне ашчаднай справы.

Спыніўшыся на цяжкасьцях, якія сустракаюцца на шляху нашага сацыялістычнага будаўніцтва, т. Галадзед кажа:

—Мала сабрать сродкі, мала мець шырока разьвітую каапэрацыйную сетку мала мець тавары: трэба апошнія ўмець разьмеркаваць. Трэба разьмеркаваць тавары так, каб класавы прынцып быў ажыцьцёўлен на ўсе 100 пр. Тут асноўная задача—максымальна палепшыць якасьць працы тавараправадзячага апарату; патрэбна максымальная дакладнасьць працы, рашучая барацьба в бюракратызмам, злоўжываньнямі—гэта гвозьдзь усёй практычнай працы.

Тав. Галадзед прыводзіць прыклады скажэньня палітыкі партыі і ўладнізавой каапэрацыйнай сеткай пры снабжэньні таварамі сялянства. Нізоўка каапэрацыі для ўзмацненьня загатовак хлеба і сыравіны часам забывае пра нашы дырэктывы, і калі бядняк прыходзіць у каапэрацыю за таварам там яму гавораць: «ідзі туды, куды здаў хлеб і сыравіну».

Мы павінны ў першую чаргу забясьпечыць таварамі рабочага і беднякa. Тут патрэбен суровы кантроль грамалакасьці; трэба сачыць за тым каб ня было скажэньня нашай лініі каб спажывецкая каапэрацыя ня служыла кулаку, а абслугоўвала бядняка-серадняцкія масы.

У заключэньне т. Галадзед спыняецца на 2 цэнтральных задачах, якія ў сучасны момант стаяць перад урадам і ўсімі партыйнымі і грамадзкімі арганізацыямі: на загатоўках і весеньняй пасеўной кампаніі.

Загатоўкі зьяўляюцца асноўнай прычай, якая павінна гарантаваць бесперабойнае снабжэньне хлебам гораду і сялянскай беднаты і сыравінай нашых заводаў і фабрык.

Пасеўная кампанія набывае надзвычайнае значэньне. Мы вызначылі з год павялічыць ураджайнасьць на 7 проц. і пашырыць пасеўную плошчу на 3,5 проц. Гэта мы зможам ажыцьцявіць толькі пры ўмове, калі ўсе сялянскія масы прыдуць на дапамогу разьвівaньні данай задачы.

На пытаньнях пасеўнай кампаніі на падрыхтоўку да яе зьезд павінен зьвярнуць максымум увагі.

Заканчываючы сваю прамову, т. Галадзед выказаў надзею, што вопыт практыка жаночага актыву паслужыць добрым матар'ялам дзеля таго, каб мы змаглі вызначыць реальныя шляхі да ажыцьцяўленьня ўсіх пастаўленых задач, каб яшчэ хутчэй пайсьці да сацыялізму.

СЛАЎНЫ ЮБІЛЕЙ.

ДА 60-ГОДЗЬДЗЯ З ДНЮ НАРАДЖЭНЬНЯ Н. К. КРУПСКАЙ.

(Артыкул Нам. Наркамасьветы тав. Пакроўскага).

Усім вядома, што Ленін будаваў нашу партыю, але ня ўсім вядома, што будаваў ён нашу партыю ў цесным супрацоўніцтве з Надзеяй Канстантынаўнай, якая была яго бліжэйшай супрацоўніцай, і без якой будаўнічая праца Леніна была-б вельмі цяжкай, калі на зусім немагчымай. Ядром, каля якога партыя пачала складацца, была, як усім вядома, газэта „Искра". Ня ўсе ведаюць, што Надзея Канстантынаўна была сэкратаром рэдакцыі гэтай «Искры», што ўся перапіска гэтай газэты, якая выдавалася загранічаю, з Расеяй ішла праз рукі Надзеі Канстантынаўны. Бяз «Искры» ня было-б бальшавіцкай партыі, а без Надзеі Канстантынаўны ня было-б «Искры»: гэта перш усяго неабходна прыпомніць.

Калі бальшавікі арганізаваліся ўжо ў партыю (пасьля 1903 году), Надзея Канстантынаўна стала генэральным сэкратаром гэтай партыі. Тады іменна будучы сэкратаром нашага тагочаснага ЦК, я з ёю і спаткаўся. Ад Надзеі Канстантынаўны я, учарайшы «легальны марксыст», атрымліваў першыя вуркі канспірацыі, шыфроўкі і ўсякай іншай рэвалюцыйнай тэхнікі. Ці думаў я тады—ды ці магло ў ёй тады прысьці на думку, што праз 20 год мы будзем сядзець у дзяржаўным вучоным савеце і займацца таксама педагагічнымі пытаньнямі, але крыху іншага парадку?

Але калі Надзея Канстантынаўна зьяўляецца адной з заснавальніц нашай партыі, адной з цясьнейшага кола, дапамагаўшага Леніну ў гэтай вялізарнай справе, дык у адносінах марксысцкай педагогікі яна зьяўляецца адзінай заснавальнікам. Тут ужо мы ёй дапамагалі і,трэба прызнацца, дапамагалі вельмі кепска.

Перш усяго, ня ўсе ведаюць і цэняць, як сьлед, што Надзея Канстантынаўна была педагогам-тэарэтыкам да рэвалюцыі, што ў яе асобе мы маем першага педагагічнага „спэца" нашае партыі. Тая двайнасьць, якую яна разгарнула ў Наркамасьветы, была-б вусім немажліва і незразумела,калі-б яна была ў рэвалюцыйным парадку набілізавана на педагагічную працу, як многія з нас, пасьля Кастрычніка. На справе-ж тое, што вельмі многім абываталям здавалася „рэвалюцыйным захапленьнем", было толькі спробамі ажыцьцявіць старыя, даўно складзеныя і глыбока прадуманыя ідэі Надзеі Канстантынаўны, якія яна выказвала часткамі ў выданьнях яшчэ ў 1910-22 г.г. Ужо ў гэтыя і апошнія гады пісала яна аб такіх рэчах, як школьнае самакіраўніцтва, сумеснае навучаньне, працоўная школа, адносіны школы да сям'і і г. д. Яе барацьба з карамі, напрыклад, пачалася яшчэ ў 1909 годзе. На старонках «Свободного воспитания" яна пісала: „Наўрад ці ў каго-небудзь, хто задумаўся над справаю выхаваньня, існуе хоць крыху наўпэўненасьці адносна таго, што існуючая ў сучаснай школе сыстэма аднак, узнагарод, кары накіравана на разьвіцьцё самога нягожага эгаізму, на прыдушэньне ў дзецях пачуцьця салідарнасьці, узаемнай сымпатыі, на прыдушэньне пачуцьця самай элемэнтарнай справядлівасьці". І ёсьць людзі, якім у 1928 годзе гэтыя элемэнтарныя рэчы здаюцца вельмі небясьпечнай навінай! Дзе-дзе, а ў галіне педагогікі наша асьветная маса рухаецца не на аваралінне.

Калі ўлада цароў, абшарнікаў і купцоў была ў Расеі нізрынута, Надзея Канстантынаўна атрымала магчымасьць ня толькі выказваць свае заветныя думкі, не прыстасоўваючыся да цэнзурных умоў, але і ажыцьцяўляць іх на практыцы. Разам з тымі масамі, якія зрабілі рэвалюцыю, Надзея Канстантынаўна ставіла тое, што цяпер называюць «культурнай рэвалюцыяй», на самае першае месца. «Масы разумеюць, пісала яна ў 1912 годзе, «што мала адабраць у буржуазеі яе матар'яльная багацьці, трэба адабраць у яе тое, што складала да гэтага часу яе галоўную сілу—манаполію ведаў. Народ уяўляе, што толькі тады вызваліцца ад улады буржуазеі, калі будзе столькі-ж ведаючых, як яна». Нязьлічоныя чароды дэлегацый з усіх бакоў тагочаснай РСФСР прыходзілі ў Наркамасьветы, патрабуючы школ і школ—усякіх, пачынаючы ад вясковай 1-й ступені і канчаючы універсытэтам. Што рэвалюцыя і культурны ўздым ёсьць два шчыльна зьвязаныя паміж сабой зьявішчы, гэта добра разумелі нават і з другога боку барыкады. Недарма адступаючае калчакоўскае войска з гэткаю старанасьцю нішчыла нават школьныя лаўкі, падручнікі і сшыткі, якія пападалі ім у рукі.

Ідэя Надзеі Канстантынаўны абапіраць асьвету проста на масы не ажыцьцёвілася адразу па вусім зразумелых у такіх варунках прычынах. Вось які быў яе план. Яна пісала (артыкул «Контроль сверху и контроль снизу в деле народного образования»): «Водлуг думкі Камісарыяту Асьветы, трэба арганізаваць насельніцтва ў асобныя саветы народнай асьветы. Гэтыя саветы народнай асьветы складаюцца з дэлегатаў ад усіх тых арганізацый, якія пасылаюць сваіх прадстаўнікоў у мясцовы савет. У колькасьці трэцяй часткі да іх далучаюцца прадстаўнікі ад настаўнікаў і вучняў. Складзены такім чынам савет народнае асьветы выбіраецца прыблізна раз у месяц, але не радзей разу ў тры месяцы. Перад гэтым саветам дае справаздачу народны камісар, на гэтым савеце абмяркоўваюцца ўсебакова ўсе пытаньні адносна выхаваньня і адукацыі. Прымаючы пад увагу, што сход дэлегацкі, кожны дэлегат павінен рабіць даклады ў сваёй арганізацыі, што робіцца ў саветах народнае асьветы».

Толькі зараз прышоў, нарэшце, момант, калі гэта ідэя Надзеі Канстантынаўны пачынае ажыцьцяўляцца пад непасрэдным націскам самых мас, патрэбы якіх Надзея Канстантынаўна выразна ўяўляла сабе яшчэ 10 год назад, але самі масы гэтага яшчэ сабе не ўяўлялі.

Тое ж было і з працоўнай школай, выклікаўшай такое шалёнае абурэньне супроць сябе з боку нашых «прагрэсыўных» педагогаў. Нянавісьць як быццам дзіўная, на першы погляд, паколькі працоўная школа не зьяўляецца вынікам Кастрычнікавай рэвалюцыі—ідэя працоўнай школы належыць буржуазным педагогам, і Надзея Канстантынаўна пісала аб гэтых новых плынях у буржуазнай педагогіцы яшчэ ў 1912 годзе (Артыкул „В свободном воспитании": «Вопрос о трудовой школе на Берлинском конгрессе учителей»). Ідэі гэтыя пачалі зьяўляцца і ў Расеі яшчэ да рэвалюцыі, і некаль кі працоўных школ у нас існавала ўжо ў 1917 годзе. Але досыць было, каб гэту ідэю арабілі сваёй ненавісьнікі бальшавікі, каб ўсякае далейшае развіцьцё ў гэтым напрамку спынілася, і каб усе «прывязіцыя» педагогі ад працоўных п р а ц э с а ў павярнулі да вывучэньня Дастаеўскага. З свайго пункту гледжаньня „прывязіцыя» педагогі былі ў некаторай ступені падставай. Працоўная школа Н. К. Крупскай, само сабою зразумела, вусім ня была паўтарэньнем, ні нават прыстасаваньнем да савецкіх умоў школы Кершэнштэйнэра. Апошні, ставячы ў сябе працоўныя працэсы, быў за тысячу вёрст ад марксысцкай педагогікі. Для яго важна была праца, як гэткая, і ўсё. Ад гэткага дробна-буржуазнага разуменьня працы Надзея Канстантынаўна адмахнулася рашучым чынам у першым-жа нумары нашага часопісу «Народное Просвещение»: «Зараз многа гавораць аб працоўным мэтадзе, але ў сацыялістычнай школе павінен ужывацца ня толькі працоўны мэтад, але павінна быць арганізавана вытворчая праца дзяцей. Сацыялісты супроць эксплёатацыі і дзіцячай

НАПЯРЭДАДНІ ВЯСЕНЬНЯИ СЯЎБЫ.

КУЛАКІ ПАЧЫНАЮЦЬ ЗРЫВАЦЬ ПАСЕЎНАЮ КАМПАНІЮ. НЕАБХОДНА ЗГУРТАВАЦЬ УВАГУ УСЯЕ ГРАМАДЗКАСЬЦІ ВАКОЛ ВЯСЕНЬНЯЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ, З'АРГАНІЗАВАЦЬ БЕДНАТУ І СЕРАДНЯЦТВА І ДАЦЬ РАШУЧЫ АДПОР НОВЫМ КУЛАЦКІМ ВЫБРЫКАМ.

Барацьба на новым фронце.

Класавая барацьба ў вёсцы не заціхае. Яшчэ не пасьпела заціхнуць барацьба, якая абвастрылася вакол перавыбараў саветаў, як зноў паўстае новы фронт і разам з тым новая барацьба з кулаччом.

Новая барацьба з кулаччом разгарнулася навакол падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі. Кулакі прымаюць з свайго боку ўсё магчымае, каб сарваць такія важныя справы, як ачыстка насеньня, арганізацыя новых кааператыўных і калектыўных аб'яднаньняў.

Ужо паступаюць весткі з Гомельшчыны і Менскай акругі, што калі ў вёску прыязджае абоз па ачыстцы насеньня, дык кулакі адразу заяўляюць, што ў гэтай вёсцы няма чаго ачышчаць.

А да прыезду абозу кулакі сярод сялянства распаўсюджваюць чуткі—нібы ачышчанае насеньне будзе адбірацца, альбо возьмуць на вучот і калі трэба будзе забарудь. Такія гутаркі вядзе кулаччо па адрасу савецкай улады, па адрасу мясцовых савецкіх арганізацый і партыйных ячэек.

Ёсьць выпадкі, калі пасьля абгаварэньня закону ўраду аб падвышэньні ўраджайнасьці кулакі разам з «бывшымі людзьмі» выносяць пранановы аб выхадзе на хутары. (Гомельшчына). Як відно кулаччо парашыла зноў зрабіць спробы індывідуальным парадкам запужваньнем і тэрорам сарваць каштоўныя і необходныя мерапрыёмствы ўраду і партыі.

А разам з тым мы яшчэ ня маем вестак як на мясцох партыйная і савецкія арганізацыі падрыхтоўваюць беднату і серадняцтва да новага адпору кулацкім выступленьням і пераходу ў наступ. Нават болей таго, ёсьць факты калі некаторыя сельскія саветы ў Гомельшчыне выдаюць абозам па ачыстцы насеньня спраўкі нібы ў іхнім савеце няма чаго ачышчаць.

Такія паводзіны мяжуюцца з крымінальнай праступнасьцю і таму зараз-жа трэба намоцнікаў кулацкае зграі аддаваць на суд савецкай грамадзкасьці.

Трэба таксама адзначыць і тое, што шэраг нашых памылак кулакі выкарыстоўваюць ў сваю карысьць.

БУДЗЕМ СЕЯЦЬ ЧЫСТЫМ НАСЕНЬНЕМ.



Вялікае прывезьлі ў савгас Блонь (Меншчына) насеньне на абмен забруджанае насеньне мяняюць на чыстае.

Намецілі практычныя мерапрыёмствы.

Нядаўна менскім райкомам саюзу сельгаслесарабочых была склікана групавая гаспадарчая нарада з удзелам усіх спецыялістых сельскай гаспадаркі Менскага райёну, дасьледча-навуковых станцый, райагранома, земаддзелу, кангасу, кіраўнікоў савгасаў, рабкомаў і актыўных рабочых.

Нарада абгаварыла і намеціла практычныя мерапрыёмствы па правядзеньню пасеўнай кампаніі і палягаць-цю ўраджайнасьці і пастанавіла арганізаваць па мясцох тройкі, дзеля рэгулярнага асьвятленьня ходу ўсёй падрыхтоўчай працы праз друк і абмен вопытам з іншымі савгасамі і навуковымі установамі.

Арганізаваць таксама райённая камісія дзеля непасрэднага кіраўніцтва і нагляду за ходам усёй працы па правядзеньню пасеўнай кампаніі і падняцьцю ураджайнасьці.

Камісія складаецца з лепшых спецыялістых райёну і прадстаўнікоў сям. адд. кангасу і актыўных рабочых.

Камісія склала каляндарны план і ўжо прыступіла да працы прымацаваўшы на сваім пасяджэньні ўсе аграномічныя сілы райёну да кожнага насельнага пункту, райён разьбіты на 14 пунктаў.

На нарадзе выявілася доўгая падрыхтоўка да пасеўнай кампаніі па савгасу імя Анцаловіча і зусім дрэнныя адносіны адміністрацыі ў нашых «навуковых» установах. На цэнтральнай бульбянай станцыі нічога ня зроблена і на робіцца да пасеўнай кампаніі; не рамантуецца інвэнтар і транспарт, у гаспадарцы адсутнічае нават вытворчы і арганізацыйны плян і наогул няма належнага кіраўніцтва гаспадаркай, адсутнічае ўсякая сувязь з сялянствам. Кіраўнік гаспадаркай тав. Астроўскі на нарадзе заявіў, што „мы самі к сялянам ня пойдзем, няхай яны да нас зьвяртаюцца".

У навуковай фэрме імя Эйхельмана таксама да гэтага часу не абмалочаны авёс, няспраўная эбруя і ня робіцца рамонт інвэнтару.

Нарада даручыла райкому і райённай камісіі прыняць тэрміновыя меры для зьнішчэньня ўсіх недахопаў у гэтых гаспадарках да правядзеньня пасеўнай кампаніі.

Нарада знайшла ўсе магчымасьці выкараць дырэктыву партыі і ўраду БССР і павысіць ураджайнасьць у гэтым годзе на 17 проц. і пашырыць пасеўную плошчу на 6 проц.

Нарада намеціла шэраг практычных мерапрыёмстваў па правядзеньню растлумачальнай працы сярод сялянства і папулярызацыі новага закону аб с-г палатку і льготах, якія будуць даны сялянам, якія пашыраць пасеўную плошчу.

Нарада адзначыла нядбайныя адносіны з боку Б[illegible]оў, якія выразіліся ў несвачасовай падрыхоўцы насеньня, машын, угнаеньня і г. д., дзякуючы чаму маюцца вялікія нараканьні з боку сялян і савгасаў.

Р. К. С.

Рэагуюць па-бюракратычнаму.

На матар'ялах, якія ўжо друкаваліся ў газэце відаць, што многія райёны і нават акругі ў цэлым слаба праводзяць падрыхтоўку да вясеньняй сяўбы. Аб усіх заметках, якія выяўлялі недахопы гэтай кампаніі, рэдакцыя пасылала ў адпаведныя органы напамінаньні з мэтай выяўленьня гэтых недахопаў і наданьня пасеўнай кампаніі належнага размаху.

Прайшло ўжо многа часу, паслана многа напамінаньняў і пара ўжо падвесьці вынікамі. Але радасьць зьмяняецца расчараваньнем, калі мы скажам, што на дзесяткі пасланых заметак атрымана ўсяго два адказы, якія зьяўляюцца па сутнасьці чыста фармальнымі, бюракратычнымі адпіскамі. Не адказваюць аб тым, што канкретна зроблена, ці распачалі працу вернача-мысьцільныя пункты і як яны працуюць, ці прыцягнуты да адказнасьці асобы, зрываючыя падрыхтоўку і як я канкретныя вынікі—такіх адказаў няма.

А адказваюць, што „дадзена належнае ўказаньне, прыцягнут камсамол, маецца на ўвазе набыць яшчэ аднаго каня для аграпункту» (Аршанскае акрэа).

«Зварачваючы дошс „аб ачыстцы насеньня ня турбуюцца», паведамляем, што прэзыдыумам АВК прызнана работа Парыцкага РВК адносна падрыхтоўкі да вясеньняй пасяўной кампаніі нездавальняючай, аб чым паведамляецца» (Бабруйскае Акраа).

Гэта значыць паведамляецца рэдакцыя, што заметка зьмешчаная сапраўды напісьвердзілася, а што Акрэа зрабіла, каб насеньне ачышчалася ў Парыцкім райёне, гэтага яна не паведамляе, а нас галоўным чынам гэта і цікавіць.

А Менская Акрэа, куды накіраваны 5—6 напамінаньняў аб зрыве кампаніі ў некаторых райёнах зусім не рэагуе, а на тэлефоннае запытаньне, загадчык адказвае: «Пачакайце, паслана на расьсьледаваньне, альбо чакаем самі тлумачэньня», толькі і ўсё, толькі „чакаецца» па цэламу месяцу, будзе «чакацца» без напраўкі справы, пакуль і сяўба прыдзе.

Менскі Акрэа думае, што ў яго ўсё ў парадку, гэта ў той час, як мен-

ТРЫЕР ГУДЗІЦЬ.



У савгасе Блонь (Меншчына) ачышчаюць на трыеры насеньне да пасеўнай кампаніі.

Калгасы Полаччыны рыхтуюцца да пасеўкампаніі.

(Ліст з Полацку).

У аснову правядзеньня пасеўнай кампаніі па калгасах Полаччыны—ляглі наступныя моманты: далейшае разьвіцьцё новых калгасаў, умацненьне і ўзбуйненьне існуючых, пашырэньне пасеўплошчы за кошт «бросовых» зямель і скарачэньне незанятага папару, павялічэньне ўраджайнасьці ўсіх сельска-гаспадарчых культур, пашырэньне тэхнічнага і прапашнага клёну.

На праяцу бягучага году мяркуецца арганізаваць 46 новых калгасаў, з якіх к часу высеўняй пасяўной кампаніі—31. Акрамя азначанага будуць арганізаваны 8 садова-гародных аб'яднаньняў у цэнтрах былых маёнткаў.

Работа па арганізацыі садова-гародных аб'яднаньняў будзе весьціся ў такім напрамку, каб удагнуць ваколічнае сялянства з далучэньнем сваёй надзельзямлі. Пры арганізацыі новых калгасаў узят курс на больш буйныя калектывы, каб зямельная плошча, як правіла, была-б ня менш 150 гектараў. Не землеўпарадкаваных калгасаў з ліку 67 засталося 5, якія будуць землеўпарадкаваны вясной гэтага году. Новыя калгасы таксама будуць землеўпарадкоўвацца ў гэтым годзе, каб была магчымасьць к наступнай пасяўной кампаніі ўдагнуць іх у сельскаспадарчы зварот.

ЗАГРАНІЦАЮ НЕ ПАДНАЧАЛЬВАЮЦЦА БАЧЭ-САКО.

ЛОНДАН, 25-II. „Дэйлі Тэлеграф" паведамляе, што між Хабібулаю (Бачэ-Сакао) назаронім гандзёвым прадстаўніком Афганстану выбухнула сварка. Пэшавартандзёвы прадстаўнік адмовіўся перадаць асобе, назначанай Хабібулаю, буйную ў грошай блізка 225.000 фунтаў стэрлінгаў (2.250.000 руб.). Гандзёвы прадстаўнік заявіў, што ён ня выдасьць грошы нікому, пакуль на высьветліцца, хто зьяўляецца правамоцным кандыдатам на афганскі трон.

НА АГРАНАМІЧНЫМ ПУНКЦЕ.

Сяляне аглядаюць насеньне (пухавіцкі райён).

Пасьпяховае правядзеньне пасеўкампаніі можа быць гарант авана пры ўмовах папаўненьня складаў рабочай сілай, так як у шмат калгасаў склад не папоўнен і не спраўляецца з работай—па гэтаму прадугледжваецца па-

поўніць склад калгасаў на 100 сялян.

Пасяўная плошча пад калгасамі значна будзе пашырацца да 3.670 гектараў, што да агульнай плошчы пахаці будзе складаць 79,1 проц. у (мінулым годзе гэты процант складаў 76). За кошт распашкі выганаў і сухадольных сенажаньцяў пашня будзе пашырана на 120 гектараў. Пасяўная плошча яравых у мінулым годзе складала 1720 гект., а ў гэтым годзе павялічыцца на 158 проц. Гатункавага насеньня патрабуецца: аўса—650 цэнтнэраў, ячменю—180 і бульбы 58 цэнт.

Камуна «Чырвоная Зорка» у далейшым таксама будзе прадаўжаць сартапрабаваньне на пяці гатункам бульбы. У гэтым годзе процант удабрэмай пашні мяркуецца давесьці да 35, а ў мінулым годзе было 24. Лубінам на ўгнаеньне будзе засеяна 101 гект. У данай пасяўной кампаніі ўсімі калгасамі будзе прыступлена да загатоўкі торфу на ўгнаеньне, бо тарфяныя залежы маюцца амаль каля ўсіх калектыўных гаспадарак.

Падрыхтоўчая праца па правядзеньню веснавой пасяўной кампаніі пачата сваечасова—да яе рыхтуюцца ўсе калгасы.

Анучын Пятрусь.

Роля жанчыны ў падвышэньні ураджайнасьці.

У шэрагу мерапрыёмстваў, вызначаных Савецкім урадам для падвышэньня ўраджайнасьці і вытворчасьці сельскае гаспадаркі, вялікае значэньне мае пашырэньне сельска-гаспадарчых ведаў на вёсцы. Без правядзеньня належным чынам гэтага мерапрыёмства нельга сур'ёзна ставіць пытаньне аб падняцьці працаўнасьці дробнае сельскае гаспадаркі.

Арганізацыя павышэньня ведаў павінна праводзіць у нашых школах, а сярод дарослага насельніцтва агранамічныя веды павінны пашыраць праз арганізацыю спэцыяльных курсаў, гутарак, праз папулярную сельска-гасп. літаратуру і г. д.

На вялікі жаль у нас на традыцыі і да гэтага часу вельмі мала яшчэ звяртаецца ўвагі на сельска-гаспадарчую асьвету жанчыны: з імі мала праводзіцца гутарак на тэмы сельскае гаспадаркі, іх вельмі мала яшчэ бывае на сельска-гаспадарчых курсах. А між тым мы добра ведаем, што нават вясковая жанчына звычайна пераважна займаецца гародніцтвам, жывёлагадоўляй і нават пераважна дагляс за гэткімі культурамі як лён, бульба. Дасылаемыя ў вёску няспраўныя трыеры, неправераныя на ўсходжасьці насеньне, усё гэта льле ваду на кулацкі млын і таму трэба рашуча змагацца з усякай нядбайнасьцю пры разгортванні пасяўной кампаніі.

Добра было-б, каб і зараз, як і ў часе перавыбараў саветаў, рабочыя брыгады паехалі ў вёску на дапамогу беднаце. А шэфскія арганізацыі ня трацячы часу павінны паслаць сваіх таварышоў у вёску на пасеўны фронт.

Мясцовыя арганізацыі, не чакаючы шэфаў і рабочых брыгад, павінны па сельсаветах і вёсках арганізаваць беднату і серадняцтва вакол пасяўной кампаніі. Трэба зараз-жа арганізоўваць сходы беднаты, шырока растлумачыць важнасьць кампаніі і згуртаваць увагу ўсёй беднаты для адпору

Адбілі фашыстскі наезд.

[illegible] можна будзе вызвалiць [illegible] сельня. Зноў-жа ў гэтым пытаньні нашла вясковая жанчына магла-б зрабіць вельмі многа, бо пэпел, розныя сьмецьце і г. д. у сельскай гаспадарцы выбіраюцца і пакуль што выкідваецца абы куды жанчынай.

Трэба зьвярнуць надзвычайна сур'ёзную увагу на пашырэньне сельска-гаспадарчых ведаў сярод жанчын і асабліва ў тых галінах, дзе ў нас жанчына займае пакуль што галоўную ролю, гэта значыць, трэба навучаць яе належным чынам даглядаць за каровай і сьвіньнёй, зьвярнуць увагу на рацыяналізацыю і палепшаньне гародное справы, разьвіцьцё свойскіх птушак: кураў, гусей, качак, і інш., а таксама на зьбіранье попелу і г. д.

Для гэтага трэба праводзіць з жанчынамі спэцыяльныя гутаркі, закладаць паказальныя гароды, птушнікі, прывучыць і вясковую жанчыну чытаць сельска-гаспадарчую часопісь, папулярную літаратуру. На гэту справу павінны зьвярнуць увагу жанадзел, КМС, аграномы, настаўнікі і г. д.

В. С—іч.

КАМПАНІЯ ПАД ПАГРОЗАЙ ЗРЫВУ.

Перад намі весткі ў лічбах з райёнаў аб тым, колькі трэба ачысьціць і колькі ачышчана на сёньня пасеўнага матар'ялу. Надта-ж мізэрныя лічбы

Прыводзім іх усе, каб не падумалі, што мы тэндэнцыйна выбралі горшыя райёны, а аб лепшых ні слова.

Аршанскі райён заданьне 1261 тона, а ачышчана 1791 тона; Круглянскі—925 тон.—145,5; Горацкі—1331—470; Дубровенскі—896;—174,7; Талочынскі—1085; 189,5; Лядзянскі—520;—100; Крупскі—671;—42; Копанаўскі—1125;—125 і Копыскі—848—206,8; Багушэўскі—749;—95; Расьнянскі—585;—110; Дрыбінскі—647;—176.

Як бачыце, гэта наглядная таблічка кажа лепш за ўсё, як абстаіць справа з ачысткай насеньня.

Адзін толькі Горацкі райён да гэтага часу ачысьціў трэць заданьня. Нарадзіўшыся ў другіні райёнамі тут справа абстаіць нібы здавальняюча, але-ж трэба мець тут на ўвазе палічча Беларускай Дзяржаўнай Акадэміі сельскай гаспадаркі.

Толькі адзін Горацкі райён, калі акадэмія дапаможа, выканае заданьне поўнасьцю.

МЯДЗЬВЕЖАЯ СЬПЯЧКА Ў РАЙЁНАХ.

Лічбы, пералічаныя вышэй, сказалі сваё слова.

Згодна папяровых плянаў Наркамзему, Аршаншчына павінна была ачысьціць 12370 тон насеньня, а ачышчана ўсяго 2115 тон, як бачыце, розьніца вялікая. Гэта кажа за «рупліваснь», за «наважнасьць», якую ўдзяляюць сабе і райземаддзелы, і аграномія.

Чарэйскі райён, якому дадзена заданьне ачысьціць 872 тоны збожжа, не паклапаціўся нават паведаміць акругу што зроблена на гэтым часу.

Абозы па ачыстцы насеньня бязьдзейнічалі

(Ліст з Гомелю).

Тэмп ходу вясеньняе пасеўнае кампаніі ўмацніўся. Зерначышальныя абозы накіраваны на вёску. На 20-га лютага ў акрузе ўжо ачышчана да 150 тысяч пудоў зерна, што складае 17 процантаў заданьня. Асабліва добра разьвіваецца зерначыстка ў Веткаўскім і Брагінскім райёне. Слаба праходзіць у Хойніцкім райёне, дзе ачышчана толькі 3,5 проц. заданьня.

Трэба адзначыць, што кулацтва спрабуе і тут сарваць кампанію. У асобных селішчах кулакі кажуць сялянам:—не вяжце зерна для ачысткі, бо гэтым самым вы паведамляеце савецкай уладзе аб колькасьці зерна» Асобныя сельсаветы, замест таго, каб рэагаваць на вылазкі кулакоў, выдаюць спраўкі абозам, што ў гэтых селішчах няма зерна для ачысткі.

У некаторых селішчах Гомельскае акругі, з прычыны агітацыі кулакоў, абозы бязьдзейнічалі на некалькі дзён. Агітацыя супроць зерначыстак выдзецца ў селішчах Брагінскага райёну. Зразумела, агітацыі кулакоў даецца адпор, узмацняецца растлумачваючая праца, і сялянства перакопваецца ў пралазках кулакоў.

З арганізацыяй рамонтных майстэрняў у акрузе намячаецца зруч. У 5 ці райёнах майстэрні ўжо арганізаваны і распачатa арганізацыя рамонтных майстэрняў у Уваравіцкім, Буда-Кашалёўскім і Чачэрскім райёнах. Толькі ў самым Брагіне кавалі адмовіліся арганізаваць брцелі для рамонту сельскагаспадарчага інвэнтару, у іншых мясцох кавалі ахвотна арганізуюць брцелі.

У адносінах загатоўкі насеньня, асобныя культуры поўнасьцю загатоўлены і разьмеркаваны на мясцох, а па лубіну і канюшыне процант заданьня яшчэ недастакова выкананы. Аднак, ужыты захады да ўзмацненьня іх загатовак і трэба думаць, што заданьні будуць выкананы.

Арганізацыя сельскіх аб'яднаньняў праходзіць здавальняюча. Сялянства на справе перакопваецца ў выгоднасьці гэтых аб'яднаньняў. У акрузе ўжо арганізаваны: 37 машынных т-ваў, 38 насёлкавых, 11 насенаводных, 2 садовіна-гародных, 15 меліярацыйных і г. д. Добра разгортваецца праца па арганізацыі калгасаў.

Са зборам попелу ня ўсё стаіць добра. Прадпрыёмствы і жакты паранейшаму ўхіляюцца ад збору попелу. Так, напр. завод „Інтэрнацыянал" у Рэчыцы сабраў толькі усяго 15 п., а фабрыка „Днепр", якая можа штодзённа даць 200 п. попелу, не сабрала ніводнага пуду. Ад фабрыкі «Днепр» не адстае і лесазавод „Тэмскага", жакты і інш. прадпрыёмствы.

На асобных прадпрыёмствах бываюць выпадкі шкодніцтва. Так, на сьніры тусова-водачыны заводзе ў адной партыі попелу аказалася 95 процантаў пяску. Прыняты меры да выясьненьня прычын. Адначасна з гэтым патрабуюцца рашучыя меры ў адносіне кіраўнікоў, якія ўхіляюцца ад збору попелу. Трэба гэтых асоб прыцягваць да адказнасьці за дапамогу растраце дзяржаўных сродкаў, прычым трэба, каб пракуратура не марынавала гэтых спраў, а разглядала іх у парадку.

Калі нашыя гаспадарцы ня хочуць зразумець важнасьці збору попелу, дык трэба даць ім зразумець шляхам удару па іх кішэні. Наша акруга можа даць больш 100 тыс. пудоў попелу, а пакуль сабрана толькі да 3000 пудоў. Чым хутчэй будуць ужыты захады, тым будзе лепш.

Эн.

ВЕСТКІ З ПАСЕЎНАГА ФРОНТУ.

«УДАЛЫ» КАМІТЭТ.

Зусім не кляпоціцца Ліцьвінаўскі КСУ аб пасеўкампаніі і аб насеньні для беднаты. Старшынёй камітэту зьяўляецца заможнік Вярбіцкі. Атрымаў старшыня паперку ад Ветрынскага райённага КСУ аб тым, што Ліцьвінаўскаму КСУ адпушчана 560 пудоў аўса для беднаты і прапанавана прыступіць да разьмеркаваньня яго.

Прачытаў «удалы» старшыня паперку і належыў рэзалюцыю „даручаю сельсавету". Паперка папала да старшыні сельсавету, ад яго да сакратара і загінула.

Гэтым і абмежавалася праца Ліцьвінаўскага КСУ.

Трэба разбудзіць камітэт і выгнаць адтуль заможніка-старшыню.

А. Г.

МОЦНА СЬПІЦЬ

Талочынскі мест. савет ня мае яшчэ плану правядзеньня пасеўкампаніі. Да выбару ўпаўнаважаных на ачыстцы насеньня яшчэ не прыступілі.

Мясцовая партыйная ячэйка наставіла на сходзе пытаньне аб пасеўкампаніі. Пытаньня не абгаварылі, з прычыны непадрыхтаванасьці старшыні савету да дакладу.

Неабходна каму належыць штурхануць і прабудзіць спячых.

Х. З.

ТРЭБА ПАПРАВІЦЬ.

У Дамановіцкім сельска-гаспадарчым таварыстве (Мазырск. акр.) ёсьць трыер, які прызначан для чысткі збожжа на ўсяму райёну.

Трыер няспраўны, а аб спраўленьні яго ніхто на думае. Акрамя гэтага былі выпадкі, што ён дзе-небудзь знаходзіцца ў аднаго гаспадара ў сьвірні, а ніхто аб ім ня ведае.

Ці не пара яго справіць, пусьціць на райёну і паведаміць аб гэтым сялян.

ВАС.

ЗАМЕСТ БАЛОТ—ЗЯЛЁНЫЯ НІВЫ.

Шмат гадоў жылі сяляне вёскі Басва Лядзянскага райёну ў акружэньні балот. Шмат ярнелі, бо з балот запівала і разьлю.

Зараз, дзякуючы растлумачэньню агранома, сяляне ўзяліся за асушку балот. Пастунова, агульнымі сіламі пад кіраўніцтвам тэхніка па торфараспрацоўцы і агранома балоты асушваюцца.

Ужо шмат асушана, але яшчэ шмат іх засталося. Можна спадзявацца, што ў хуткім часе замест балот будуць красавацца зялёныя нівы.

Латыш.

Ратуйце пасеўную кампанію на Аршаншчыне.

Кампанія тоне ў папяровым моры, чыноўніцкім бязладдзі і мядзьвежай сьпячцы райённых працаўнікоў.

Так. Сапраўды ратуйце, дапамажыце знайсьці пасеўную кампанію ў райёнах Аршанскай акругі. Акрэа ўжо выбіўся з сіл, шукаючы і чакаючы выніка́ў аб тым, што зроблена ў райёнах. З райёнаў ні слуху, ні духу аб практычных выніках на мясцох.

Ёсьць сухія лічбы аб вельмі нязначнай праробленай працы па ачыстцы насеньня і на гэтым кропка. Райённая агранамія, райённыя земельныя ўстановы быццам патанулі ў папяровым моры цыркуляраў, пастаноў і адносін, альбо ня вытрымалі «наступу» сваіх-жа, чыноўніцкіх адносін да ўдарнай кампаніі і палягліі «касьцьмі» на гэтым важным фронце.

РУПЛІВЫ І УПАРТЫ КІПРЫЯНЕЦ.

У акрузе 1 ў самай Воршы толькі адзін чалавек застаўся ў балявой гаспадарцы і разам з усім Акрэа выступіў за ўсеагульны за добрае правядзеньне пасеўнай кампаніі.

Гэта акруговы агранам тав. Кіпрыянец.

Той самы Кіпрыянец, якога ведае сялянства Аршаншчыны як руплівага працаўніка-грамадзяніка, працуючага на перабудове вёскі, якога ведае камсамолія Аршаншчыны, супольва з якою ён выступіў у «паход за падвышэньне ўраджайнасьці».

Той самы Кіпрыянец, якога у адзін дзень можна бачыць у Акрэа ў Воршы і ў лапёкай вёсны любога раёну Аршанскай акругі, дзе ён тлумачыць карысьць калектыву, шматпольля, ачысткі насеньня і г. д.

Гэты самы Кіпрыянец праводзіў усю падрыхтоўчую працу да пасеўнай кампаніі, будучы на чале розных вылучаных камісій.

Але добра праведзеная праца ў акрузе ня кажа, што таксама добра яна праводзіцца ў райёне розным чынам і чынушамі.

Райёны ў большасьці зусім нядбайна аднесьліся да гэтай вялікай справы.

Па вестках, праўда вялоўных, бо некаторыя райёны нават нічога не паведамляюць у акругу, справа абстаіць зусім кепска, і калі не пачалася яшчэ кампанія па ачыстцы насеньня так, як трэба, дык не пачалася таму, што належныя установы папяровня не ачысьціліся ад «чынш» якія можа сьвядома зрываюць гэту працу.

КАМПАНІЯ ПАД ПАГРОЗАЙ ЗРЫВУ.

Перад намі весткі ў лічбах в райёнаў аб тым, колькі трэба ачысьціць і колькі ачышчана на сёньня пасеўнага матар'ялу. Надта-ж мізэрныя лічбы

Прыводзім іх усе, каб не падумалі, што мы тэндэнцыйна выбралі горшыя райёны, а аб лепшых ні слова.

Аршанскі райён заданьне 1261 тона, а ачышчана 1791 тона; Круглянскі—925 тон.—145,5: Горацкі—1331—470; Дубровенскі—896;—174,7; Талочынскі—1085; 189,5; Лядзянскі—520;—100; Крупскі—671;—42; Копанаўскі—1125;—125 і Копыскі—848—206,8; Багушэўскі—749;—95; Расьнянскі—585;—110; Дрыбінскі—647;—176.

Як бачыце, гэта наглядная таблічка кажа лепш за ўсё, як абстаіць справа з ачысткай насеньня.

Адзін толькі Горацкі райён да гэтага часу ачысьціў трэць заданьня. Нарадзіўшыся ў другіні райёнамі тут справа абстаіць нібы здавальняюча, але-ж трэба мець тут на ўвазе палічча Беларускай Дзяржаўнай Акадэміі сельскай гаспадаркі.

Толькі адзін Горацкі райён, калі акадэмія дапаможа, выканае заданьне поўнасьцю.

МЯДЗЬВЕЖАЯ СЬПЯЧКА Ў РАЙЁНАХ.

Лічбы, пералічаныя вышэй, сказалі сваё слова.

Згодна папяровых плянаў Наркамзему, Аршаншчына павінна была ачысьціць 12370 тон насеньня, а ачышчана ўсяго 2115 тон, як бачыце, розьніца вялікая. Гэта кажа за «рупліваснь», за «наважнасьць», якую ўдзяляюць сабе і райземаддзелы, і аграномія.

Чарэйскі райён, якому дадзена заданьне ачысьціць 872 тоны збожжа, не паклапаціўся нават паведаміць акругу што зроблена на гэтым часу.

Сьпяць ня толькі ў Чарэйскім райёне, сьпяць мядзьвежым сном у Дрыбінчыне, Крупскім райёне, Дубровенскім, Коханаўскім і Багушэўскім.

Сьпяць працаўнікі, а з імі і такая паважная кампанія як падрыхтоўка да сяўбы.

НЯМА РУПЛІВАГА ГАСПАДАРА

Акругай на пасеўны фронт накіравана 65 збожжаачысных абозаў. «Трыумфы», «Трыеры» пакладзены на возы і накіраваны ў распараджэньне райёнаў для поўнага выкарыстаньня. Але гэтыя абозы, як звычайныя вайсковыя, плятуцца ў хвасьце рэгулярнага пасеўнага фронту, чакаюць хто-ж, урэшце, знойдзе патрэбу—пакарыстацца імі, чакаюць загадаў райённага начальства.

Шмат збожжаачысных машын з паломанымі восямі, ато без адной-дзьвюх шрубак ці калёсіка, як пасьля страшэннай бойкі (альбо бітвы якога пакланяньня ў Беларусі); моўчкі ляжаць на складах камітэтаў сялянскай узаемадапамогі і чакаюць руплівага гаспадара, каб атрымаць невялічкі рамонт і потым уліцца ў першыя шэрагі збожжаачыснага фронту.

Гэтых гаспадароў ва ўсіх райёнах на жаль бракуе. Камітэты сялянскай узаемадапамогі не разварушыліся—сьпяць, а «трыеры» іржавеюць, пад сьнегам гніюць дарма на нядбайнасьці некаторых непаваротлівых працаўнікоў.

ШТО ТАКОЕ ТРЫЕР І ДЗЕ ЁН?

Калі вы в райёну, з яго цэнтру, ат'язджае кожны калей у вёску, каб азнаёміцца, урэшце, дасканала, як-жа абстаіць справа в падрыхтоўкай да сяўбы, дык і тут у большасьці вёсак, як і ў большасьці райёнаў, справа, як кажуць, плача і чакае, хто яе падштурхне.

Сельсаветы, на прыкладу райёнаў, нікуды не сьпяшаюцца, падпісваюць «цікучыя» паперкі, адносіны в райёнаў аб падатку, самаабкладаньні, штрфах і іншых. Падпішуць, а потым... таксама сьпяць. Важнейшая работа—растлумачыць сялянам карысьць засеву ачышчаным насеньнем, пратрубіць насеньне, сказаць, у якім месцы знаходзіцца зараз збожжаачысны пункт і інш.—гэта работа відаць і ня значыцца ў планах падрыхтоўчай працы да сяўбы.

У сельсаветчыкаў на гэта, відаць, ёсьць свой погляд: «работа ня воўк, у лес не ўцячэ».

Гэта мы ня кажам у адносінах да ўсіх вёсак і сельсаветаў, бо ёсьць такія адзінкі-вёскі, якія ачысьцілі 100 проц. насеньня, але калі з вызначанай лічбы—12370 тон ачышчана ўсяго толькі—2115 тон, дык сьмела можна сказаць, што далёка яшчэ вёскі Аршаншчыны не ўзварушаны, каб спатканць вясеньнюю сяўбу зусім падрыхтыванымі.

Нават і такі факт, калі пытаешся ў селяніна, якая збожжаачысная машына у вас працуе—«трыер» ці якая іншая і дзе яна знаходзіцца?—дык на гэта запытанье вы атрымаеце адказ наступнага зьместу. «А ліха яго ведае, што гэта за «трыер», а ня толькі каб ведаць, дзе яно стаіць».

Гэта зусім не надумана, гэта факт, які мы месяца ў Дрыбінскім райёне.

Гэты факт ліпні вам паведзьвівае, што кампанія над пагрозай зрыву, і што патрэбны тэрміновыя меры.

Трэба дадаць і тое, што пытаньне збору попелу (аб карысьці якога ведае ня толькі райагранам, але і малое дзіцё, якое чытае „Беларускі Піянэр" ці вучыцца ў школе), гэта пытаньне ператвараецца ў жыцьцё вельмі і вельмі марудна. Попел у большасьці сваёй, па старому, замяняе пясок для засыпкі коўзкіх месцаў ля студні, ці насыпкі сьцежак. І для растлумачэньня карысьці попелу ў вёсцы мала зроблена.

ПАДАЕ НАДЗЕІ ТОЛЬКІ КАМСАМОЛ.

Заўсёды руплівы і ўпарты ў сваёй працы аршанскі камсамол (які, на жаль, ня можа адзін выканаць усю кампанію, а каб мог дык зрабіў-бы) і тут ідзе на першым месцы. Ня так даўно мы пісалі ў газэце «Сав. Беларусь» (№ 36—ад 15-II 29 г.) аб тым знаходзе за ўраджай, які абвесьціла аршанская камсамолія; камсамолія і зараз у пасеўкампаніі зрабіла многае.

АК КСМ супольна з акрэа, выдаў брашурку па гэтаму пытаньню.

Складзены ўдарныя і ініцыятыўныя групы па розных галінах падрыхтоўкі да сяўбы.

Ячэйкі і РК КСМ вылучылі групы па аднаўленьні непрацуючых збожжаачысных машын.

Некаторыя райёны зрабілі масавыя выхады ў вёску дзеля растлумачэньня важнасьці зерначышчэньня ў сельскай гаспадарцы.

Аршанская чыгуначная арганізацыя выключна рабочая, зрабіла выхад у падшэфныя вёскі. Узброіўшыся сялянска-кузьнечнымі прыладамі, ахованая ад нападаў кулакоў, яна ўзялася за ачыстку насеньня.

Сельсаветы, на якія ўскладзена адказнасьць за ачыстку насеньня, ня могуць ня ведаць, што ў іх ёсьць збожжаачысныя машыны, але ніхто з іх не ўзяўся за ачыстку.

Ці не пара ўжо ўзяцца за ачыстку насеньня, ці не пара ўжо ўзяцца за ачыстку насеньня, ці не пара ўжо ўзяцца за ачыстку насеньня?

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова

Эканамічнай Нарады пры Савеце Нар. Камісараў БССР

пра патаненьне будаўніцтва ў будаўнічым сэзоне 1929 году.

На падставе пастановы Савету Працы і Абароны за 21 сьнежня 1928 году (З.З. СССР 1929 г., № 4, арт. 34) Эканамічная Нарада пры Савеце Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць народныя камісарыяты, акруговыя выканаўчыя камітэты, а таксама кааперацыйныя арганізацыі вьменшыць у будаўнічым сэзоне 1929 году кошт намечанага імі прамысловага будаўніцтва без абсталяваньня яго мэты, чымся на 15 проц., а кошт жылішчнага будаўніцтва на менш, чымся на 11 проц., у параўнаньні з фактычным коштам у 1928 годзе.

2. Паказанае (арт. 1) вьменшэньне кошту зрабіць:

а) за лік больш эканомнага праектаваньня ў плянавачных і ў канструкцыйных адносінах, не пагаршаючы, аднак, тэхнічных якасьцяй пабудовы і яе прыгоднасьці для эксплёатацыі праз ужываньне больш простых канструкцый, зьнішчэньне непатрэбнічны, вьменшэньне надмерных норм нагрузкі, запасаў трываласьці і г. д., ня менш чымся на 8 проц. агульнага кошту прамысловага будаўніцтва і ня менш чымся на 6 проц. агульнага кошту жылішчнага будаўніцтва;

б) за лік вьменшэньня продажных цэн на будаўнічыя матар'ялы, больш эканомнага і рацыянальнага скарыстаньня матар'ялаў, замены іх больш танныя, зьнікненьня выдаткаў на транспарт, механізацыі і спрашчэньня будаўнічых працэсаў, павялічэньня прадукцыйнасьці працы, увядзеньня правільнай сыстэмы падзелу будаўніцтва, вьменшэньня накладных і арганізацыйных выдаткаў, агульна-тэхнічнай рацыналізацыі будаўніцтва, правільнай і своечасовай падрыхтоўкі да будаўніцтва і г. д.—ня менш, чымся на 7 проц. агульнага кошту прамысловага будаўніцтва і ня менш чымся на 5 проц. агульнага кошту жылішчнага будаўніцтва.

3. Запрапанаваць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі разам з Народным Камісарыятам Гандлю ўстанавіць на працягу двух тыдняў адначасна вьменшаныя цэны на ўсю групу будаўнічых матар'ялаў і падаць у Эканамічную Нараду не пазьней 15 сакавіка дакład аб нарадзе і ходзе выкананьня вьменшэньня кошту (арт. 2), а таксама падзел вьменшэньня па асобных сустаўных элемэнтах.

4. Каб забясьпечыць прамысловасьць будаўнічых матар'ялаў граніцы, абавязаць Народны Камісарыят Фінансаў, Белкамунбанк, Банк доўгатэрміновага крэдытаваньня прамысловасьці і акруговыя выканаўчыя камітэты сваячасна і рэгулярна фінансаваць прамысловасьць будаўнічых матар'ялаў в тым, каб да 1 ліпеня 1929 году было выдана ня менш 80 проц. гадовага прызначэньня, прадугледжанага кантрольнымі лічбамі дзяржаўнага і мясцовага бюджэту і доўгатэрміновага крэдыту, і справаздачу аб фактычным выкананьні гадовага асыгнаваньня на 1 ліпеня 1929 году падаць у Эканамічную Нараду не пазьней 15 ліпеня гэтага году.

5. Запрапанаваць ВСНГ і акруговым выканаўчым камітэтам ужыць самыя рашучыя захады да патаненьня перавозкі пяску, жвіру, гліны, друзу і арганізаваць у вялікіх цэнтрах будаўніцтва механічнае здабыванне паказаных матар'ялаў.

6. Запрапанаваць ВСНГ і акруговым выканаўчым камітэтам ужыць тэрміновыя захады па палепшаньня якасьці будаўнічых матар'ялаў, у пасобку поглы, вапны, аконнага шкла, дзьвярных і аконных матар'ялаў.

7. Абавязаць дзяржаўныя, кааперацыйныя і грамадзкія арганізацыі, якія вядуць прамысловае будаўніцтва, да выданьня новых норм праектаваньня прамысловага будаўніцтва, кіраванца часоваю інструкцыяю да існуючых норм праектаваньня капітальнага прамысловага будаўніцтва, абвешчанаю ў загадзе ВСНГ СССР за 1928 год № 84.

8. Абавязаць установы і арганізацыі, якія вядуць будаўнічыя работы, складаць гадовыя і квартальныя апэратыўна-фінансавыя планы з такім разьлікам, каб: а) даўжыня будаўнічага сэзону была ня меншаю 7 месяцаў з найбольш поўным і роўнамерным разьмеркаваньнем будаўнічых работ на ўсе месяцы будаўнічага сэзону; б) максымальна скарыстаць зімовы пэрыяд для ўнутраных работ для загаяньня, паль, загатоўкі арматуры, шчытоў, загатоўкі кроквенных форм, накат, перагародак, будаваньне складаў і іншых будаўнічых работ.

У зімовы час павінны здавацца заказы на ўсе часьці пабудовы, якія можна зрабіць загадзя і па-за будовай.

9. Нагляд за выкананьнем гэтай пастановы ўскласьці на НК РСІ і яго мясцовыя органы.

Старшыня Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР
М. Карыніч.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР
В. Крывіцкі.

18 лютага 1929 г.
г. Менск.

На мясцох губяць жывую справу.

(З пасяджэньня менскай акруговай конкурснай камісіі).

Менская акруговая камісія садзейнічаньня правядзеньню конкурсу на лепшую сэкцыю гарсавету, лепшыя сельсаветы і мястачковыя саветы в іх камісіямі вызначыла для прэміраваньня апошніх 8 прэмій.

2 прэміі ўстаноўлены для лепшага сельсавету і мястачковага савету—у 300 і 200 руб.; 4 прэміі для лепшых камісій саветаў—у 250, 200 і дзьве па 125 руб.; 2 прэміі для лепшых сэкцый гарсаветаў у 400 і 250 руб.

Апрача таго вызначана 7 прэмій ва лепшыя карэспандэнцыі на гэты конкурс. Прэміі ўстаноўлены адна—у 40 руб., дзьве па 25 руб. і 4—па 15 руб.

Усе прэміі будуць выдадзены рэчамі. Пры гэтым пытаньне аб тым, якія рэчы даць у прэміі, будзе вырашана пасьля таго, як высьветліцца, хто прэміруецца.

Унутрыакруговы конкурс канчаецца па акрузе 1 сакавіка. Пасьля гэтага тэрміну ўсе райённыя камісіі садзейнічаньня конкурсу павінны падагуліць матар'ял па апошняму і з сваімі вывадамі прадставіць у акруговую камісію не пазьней 10 сакавіка.

На гэтым-жа пасяджэньні акруговая камісія абгаварыла інфармацыю аб ходзе конкурсу на мясцох.

На вялікі жаль, матар'ялы аб разгортваньні працы на правядзеньню конкурсу ёсьць толькі з менскай гарадзкой камісіі, а таксама в камісій Пухавіцкага, Лагойскага, Бярэзінскага, Койданаўскага, Грэскага і Капыльскага райёнаў. З іншых райёнаў няма ніякіх вестак, і што там робіцца,—зусім невядома.

З інфармацыі відаць, што ў перапіханых райёнах камісіі садзейнічаньня ўтворацны ў пэрыяд з 20 сьнежня да 15 студзеня. Пытаньне правядзеньня конкурсу абгаварвалася на пленумах райвыканкомаў, сельсаветаў і мястачковых саветаў. Прыцягнута да конкурсу ўвага і мясцовых грамадзкіх арганізацый: пытаньне конкурсу абгаварвалася на агульных сходах членаў прафсаюзаў, на дэлегацкіх сходах і г. д.

Усё-ж па некаторых сельсаветах і мястачковых саветах амаль нічога ня зроблена для разгортваньня працы па правядзеньню конкурсу.

Пытаньне конкурсу высьветлялася і высьветліцца ў мясцовых насьценгазэтах.

Ёсьць на мясцох і такія недарэчнасьці, як, напрыклад, у Лагойскім райёне. Райённая камісія садзейнічаньня ў сваім пляне працы ўнесла такі пункцік—**вылучыць на конкурс Гайнскі сельсавет.** А дзе-ж, таварышы, грамадзкасьць? А дзе сялянства? Што-ж ім застаецца пасьля гатага рабіць, калі ў райёне ўжо вырашылі за іх, што сельсавет трэба выставіць на конкурс.

Наогул, трэба сказаць, што на тых матар'ялах, якія ёсьць у акруговай камісіі, цяжка судзіць аб працы на мясцох. Мы ўжо раз адзначалі, што ў Барысаве сьпяць з разгортваньнем конкурсу, але ні газэта, ні пастанова акруговай камісіі не разбудзілі нашых барысаўчан, і апошняй жшчэ раз прышлося адзначыць зусім слабае разгортваньне працы на правядзеньню конкурсу ў Барысаве.

А можа ў Барысаве наогул няма чым пахваліцца?

В. З-ў.

Памольны збор — асноўны фонд для здавальненьня патрэб сялянскай беднаты.

Да гэтага часу вьяўляецца для многіх незразумелым і асабліва для мас сялянства насельніцтва, для якой моты ўведзен памольны збор за перапрацоўку зярна сялянскіх і іншых прыватных памольцаў зярном, а не грашыма.

Дзеля асьвятленьня гэтага пытаньня прыводзім наступнае:

Колькасьць зярна, якое перапрацоўваецца штогодна ў сельскіх млынох, складае звыш 50 мільёнаў пудоў. Да 1927 г. памольная плата не рэгулявалася, прычым апошнія спагаялася млыновымі прадпрыёмцамі амаль выключна натурай (зярном) у разьмеры ад 3 да 4 фунтаў за пуд простага памолу, з разрахунку ня з колькасьці фактычна перапрацаванага для памольцаседзініца зярна, а з колькасьці зярна, прывезенага ў млын, уключаючы і зярно, якое млынар адсыпае сабе, як памольную плату.

Увесь памольны збор, колькасьць якога дасягала па Беларусі звыш 4 мільёнаў пудоў у год, у большасьці нападаў прыватным уласьнікам млыноў, якія яго скарыстоўвалі для спэкулятыўных мэтаў: затрымлівалі яго ў млынох і ня выпускалі ў продаж, пакуль не адчуваўся на рынку недахват у хлебе, пасьля чаго прадавалі яго па значна вышэйшай цане часта тым-жа памольцам.

Улічваючы ўсе гэтыя ненармальнасьці, у 1927 г. была ўстаноўлена для ўсіх млынавых прадпрыёмстваў цьвёрдая памольная плата ў грашовай форме, прычым было дапушчана ў тых выпадках, калі памолец пажадае плаціць натурай, а не грашыма,—брань зярном, выходзячы з устаноўленай грашовай таксы і існуючай цаны на зярно.

Гэта мерапрыёмства значна зьнізіла памольную плату, аднак, яно не апраўдала сабе ў адносінах спыненьня прытоку ў млыны хлеба, з прычыны таго, што сялянства знайшло для сябе не заўсёды магчымым плаціць за памол грашыма і амаль выключна плаціла зярном, што, такім чынам, спрыяла млынапрадпрыёмцам і ў далейшым выкарыстаць ад сялянства значную колькасьць хлеба.

Улічваючы гэтыя акалічнасьці і ставячы мэтай забясьпечыць у плянавым парадку біднейшае сялянскае насельніцтва хлебам, пастановай Наркамгандлю БССР ад 6-VI 28 г. была ўведзена цьвёрдая памольная плата за перамол зярна сялянскіх і іншых прыватных памольнаў выключна натурай (зярном), з абавязаньнем усіх млынапрадпрыёмстваў усяго памольнага збору мясцовай спажывецкай кааперацыі па цьвёрдай загатоўчай цане; кааперацыя разьмяркоўвае яго ў перапрацаваным выглядзе (мукой) па ўзгадненьні з сялянскімі таварыствамі ўзаемадапамогі паміж бяднейшым сялянскім насельніцтвам па ўстаноўленай цьвёрдай цане.

Гэтым мерапрыёмствы, якія адначасова былі ўжыты ва ўсім нашым Саюзе, як паказала практыка, поўнасьцю сабе апраўдалі тым, папершае, што атрыманьне ад сялянпамольнаў платы натурай (зярном), а не грашыма, захоўвае той спосаб расплаты, які даўно існуе ў сялянскім быце, а па-другое, тым, што хлеб, які паступае ад памольнага збору, вьяўляецца асноўным фондам для здавальненьня патрэб сялянскай беднаты.

Калі ўлічыць, што памольны збор у асноўным уносіцца серадняцкай і заможнай часткай вёскі і што гэты збор ідзе ў асноўным на здавальненьне патрэб бядняцкай часткі той-жа часткі і таго-ж райёну, будзе вразумела, што матад атрыманьня ад памол зярном палкам здавальняе бядняцкую і блізкую да яе серадняцкую частку. Усё сказанае гаворыць за тое, што гэты матад сабе палкам апраўдаў.

Устаноўлены парадак атрыманьня памольнай платы натурай узаконен вышэйшымі ўрадавымі органамі (С. П. А., СНК СССР і СНК БССР), прычым устаноўлена суровая адказнасьць за яго парушэньне.

Ня гледзячы на ўстаноўленую сыстэму кантролю за правільнасьцю спагаяньня млынапрадпрыёмствамі памольнага збору і поўнай здачы яго мясцовай кааперацыі, да гэтага часу нагляджаюцца выпадкі парушэньня млынапрадпрыёмцамі гатых мерапрыёмстваў.

Адзінай мерай поўнага забясьпечэньня мерапрыёмстваў па ўтварэньні хлебнага фонду, які прызначан для здавальненьня патрэб сялянскай беднаты, вьяўляецца сталы грамадзкі кантроль за млынапрадпрыёмцамі, у якім павінен браць удзел кожны сьвядомы селянін, паколькі ён вьяўляецца ў гэтым зацікаўленым, і паколькі гэтым самым будзе ў значнай меры забясьпечаны іх патрэба ў хлебе.

Л. Галкін.

ВЫБІРАЕМ У ГАРСАВЕТ ЛЕПШЫХ.

Трэба забясьпечыць дзяцей беднаты.

(На сходзе рабочых абойнай фабрыкі).

З 206 рабочых абойнай фабрыкі на сход зьявілася 182 выбаршчыкі. Наказ гарсавету разьбіраецца па пунктах. Гарачыя спрэчкі выклікае пункт аб паляпшэньні становішча школ. Рабочыя патрабуюць, каб у школах дзецям беднаты выдавалі гарачае харчаваньне. Многія дзеці ня могуць хадзіць у школу, бо ня маюць вопраткі; трэба іх забясьпечыць цёпльм адзеньнем.

Рабочыя сходу зьвярнулі ўвагу на тое, што нашы акраіны яшчэ далёкі да ўпарадкаваньня. Трэба рашуча ўзяці да за забрукаваньне вуліц і належна асьвятліць іх. Яшчэ да гэтага часу на вуліцах Менску можна спаткаць бясьпрытульных. Ня глядзячы на ўсе кампаніі, бясьпрытульных яшчэ шмат. Трэба, каб гарсавет ужыў самыя рашучыя меры для барацьбы в бясьпрытульнасьцю і прастытуцыяй.

Да гэтага часу 30 проц. кватэрны плянў прыватных дамоў няправільна выкарыстоўваецца. Гарсавет павінен правесьці праверку, хто займае гэты плянў, і васяліць яго рабочымі.

Разабраўшы дакладна ўсе пункты наказу, сход прыступіў да перавыбараў. Абраны 2 дэпутаты— тав. Гелер, партыец, сэкратар камсамольскай ячэйкі і т. Ганцэвіч, беспартыйны.

Пабудуйце інтэрнат для хатніх работніц.

(Сход працаўнікаў сталовак).

У сталоўцы № 6 адбыўся перавыбарчы сход працаўнікоў 1, 6 і 8 сталовак МЦРК. На сход зьявілася толькі 50 проц. усяго складу працаўнікоў, бо другая зьмена была занята на працы.

У спрэчках выступіла 10 чалавек. Былі ўнесены дадаткі.

Гарсавет павінен зьвярнуць асаблівую ўвагу на жыльлёвае будаўніцтва.

У бліжэйшае 5-цігодзьдзе трэба зьвярнуць больш увагі на грамадзкае харчаваньне. Дзеля таго, каб забясьпечыць патрэбы гораду ў гарачым харчаваньні, адчыніць цэны шэраг новых сталовак.

Гарачае падтрыманьне выклікаў дадатак аб арганізацыі інтэрнату для хатніх работніц. Пры сучасных умовах, калі хатняя работніца застаецца бяз працы, ёй няма куды дзецца.

Хатняя работніца павінна мець свой поўны прытулак, трэба неадкладна паклапаціцца аб інтэрнаце.

Сход абраў дэпутатамі гарсавету т. Окунь (жанчына, беспартыйная) і кандыдатам т. Зьмітрыева (камсамолец).

ХРОНІКА.

ВЫТВОРЧАСЬЦЬ БУДАЎНІЧЫХ МАТАР'ЯЛАЎ.

З кожным годам наша капітальнае будаўніцтва павялічваецца ўсё больш і больш. Адгэтуль прыходзіцца назіраць крызіс в будаўнічымі матар'ялямі. Для ліквідацыі гэтага крызісу адзінымі выхадам зьяўляецца павялічэньне вытворчасьці на існуючых прадпрыёмствах і і пабудова новых заводаў па вырабу будаўнічых матар'ялаў.

Сёлета сетка прадпрыёмстваў па вырабу будаўнічых матар'ялаў досыць значна пашырыцца. Так, па рэспубліканскай прамысловасьці будуецца 7 новых цагельных заводаў—у Гомелі, Магілеве, Менску і іншых гарадох БССР. Будуецца таксама цэмантны завод у Крычаве, завод тарфяных пліт і мэханізаваны шкляны завод у Гомелі.

Апрача таго, прадбачыцца пабудова некальких заводаў па мясцовай прамысловасьці: 2 цагельных заводы ў Менску і Віцебску і некалькі заводаў з касельскімі печамі. У Менскай акрузе ёсьць на ўвазе пабудаваць завод гліняной чарапіцы.

Пачатак выпуску прадукцыі на новых цагельных заводах вызначан на жнівень—кастрычнік г. г., цэмантны і шкляны заводы першую прадукцыю дадуць каля 1 студзеня 1931 году.

Такім чынам, рэальныя вынікі ад пабудовы новых заводаў па вырабу цэглы мы атрымаем ужо сёлета: імі будзе выпушчана ў наступны сэзон да 3000000 шт. цэглы.

Побач з пабудовай новых заводаў павялічэньне выпуску цэглы дасягнута шляхам пераходу на стандартную цэглу.

У 1927-28 годзе ўсімі заводамі было выпушчана 16000000 штук цэглы, а ў 1928-29 годзе будзе выпушчана ўжо 26 мільёнаў штук. Фінансаваньне новых прадпрыёмстваў па вырабу будаўнічых матар'ялаў поўнасьцю забясьпечана і ніякіх перабояў у гэтай галіне не прадбачыцца.

НА ПАБУДОВЕ САНАТОРЫЯ ІМЯ 10-ГОДЗЬДЗЯ БССР.

Сёлета на скончэньне пабудовы санаторыя імя 10-годзьдзя БССР (быв. Сасноўка) адпушчана 275.000 руб.

На гэтыя сродкі будзе пабудаваны каменны будынак для 3-га павільёну. У павільёне будзе абсталявана шэраг габінэтаў: гідратэрапіі, рэнтгенаўскі, электралячэбны, горла, носа і вуха, а таксама і заля для апэрацый.

Разам з тым сёлета будуць пабудаваны агульнае памяшканьне для служачых на 50 чалавек, асобная сталоўка, розныя гаспадарчыя будынкі і будзе разьбіты парк.

У выніку—санаторы імя 10-годзьдзя БССР будзе зьяўляцца лепшай санаторыяй ў Беларусі для хворых на сухоты. Адзінам недахопам зьяўляецца тое, што пры чыгуначнай станцыі няма памяшканьня для пасажыраў.

Галоўсацстрах яшчэ 2 гады таму назад паставіў пытаньне перад упаўнаважаным Нар. Кам. Шляхаў аб зьніжэньні гэтага недахопу, але дагэтуль нічога адказу нямо. Між тым у сувязі з адчыненьнем санаторыя імя 10-годзьдзя БССР пасажырскі рух значна павялічыўся, і з прычыны спазьненьня цягнікоў сухотным хворым прыходзіцца чакаць апошніх над адкрытым небам на 2-3 гадзіны.

Рыхтуемся да Міжнароднага Жаночага Дню.

Цэлы шэраг арганізацый рыхтуюцца зараз да правядзеньня міжнароднага жаночага сьвята—8 сакавіка.

Саюз хімікаў ладзіць 10 сакавіка на гуце «Пралетарыі» вечар жанчын-работніц і жонак рабочых.

Саюз хімікаў высоўвае адну жанчыну на пасаду адказнага сэкратара страхкасы.

Саюз камунальнікаў пастанавіў арганізаваць дзіцячы пакой пры клюбе камунальнікаў і дзіцячую пляцоўку для дзяцей членаў свайго саюзу.

Падрыхтоўка кваліфікаванай рабочай сілы.

У бягучым месяцы на менскія курсы Цэнтральнага Інстытуту Працы быў праведзен новы набор на будаўнічае адзяленьне. Прынята ўсяго 96 чалавек, з іх палова каменшчыкаў, а рэшта—атынкоўшчыкі. З 1 красавіка курсанты будуць праходзіць практычныя заняткі, а ў маі яны будуць выпушчаны, як кваліфікаваныя рабочыя.

У сучасны момант на курсах Ц.І.П. навучаецца 18 токараў, 70 слесараў, 50 кавалёў і 96 будаўнікоў—усё гэта людзі з Біржы Працы, на вакочыя поўнай кваліфікацыі.

15 сакавіка ў Віцебску адчыніцца адзяленьне курсаў Ц.І.П., будзе рыхтаваць будаўнічы цэх, які падрыхтуе каля 150 чалавек каменшчыкаў і атынкоўшчыкаў. Выпуск з гэтага цэху адбудзецца ў палове чэрвеня. Такое-ж адзяленьне адчыніць і ў Гомелі.

Зацьверджана структура хіміка-тэхналёгічнага факультэту БДУ.

Калегія Наркамасьветы абгаварыла дакład прафесара Прылежаева аб структуры хіміка-тэхналёгічнага факультэту пры БДУ.

Калегія згадзілася з тым, што на працягу першых 3 в палов. гадоў навучаньня на факультэце будзе праходзіцца агульны курс, а спэцыялізацыя—на апошніх 1 з палов. гадох.

На факультэце будуць устаноўлены ўхілы: па тэхналёгіі сілікатаў, паперы, валакна, цэлюлёзы і інш.

Распрацоўка навучальных планаў даручана прафесару Прылежаеву; побач з гэтым да гэтай справы будуць прыцягнуты спэцыялісты з ВТНУ іншых савецкіх рэспублік.

Выстаўка мастацкіх карцін.

Беларускі Дзяржаўны Музэй наладжвае выстаўку мастацкіх карцін, набытых для музэю з 3-яй усебеларускай мастацкай выстаўкі. Выстаўка адчынілася 24-га лютага і працягнецца каля 2-х тыдняў.

Курсы падвышэньня кваліфікацыі санітараў.

З 15-20 лютага пры ўсіх Менскіх больніцах пачалі працу курсы для падвышэньня кваліфікацыі санітараў і санітарак. Праграма курсаў разьлічана на 3 месяцы і ахоплена імі звыш 50 чалавек. Курсы абслугоўваюцца медыцынскімі працаўнікамі Менску ў парадку грамадзкай працы.

Аб'яднаньне кравецкіх саматужных арцеляў.

У Менску да гэтага часу працавалі 4 саматужныя кравецкія арцелі. Усе арцелі працавалі асобна і імат трапілі на розныя накладныя выдаткі. Зараз-жа ўсе 4 арцелі аб'ядналіцца ў адну вялікую арцель, у якой будзе 376 рабочых. Новая аб'яднаная арцель будзе знаходзіцца ў адным памяшканьні.

Сяляне—на курорты.

Для Менскай акругі на вясенні сэзон адпушчана 4 месцы для сялян на курортах Ялты і Ліваджі тэрмінам пачынаня на 1 з нал. месяцы. Менскі акрывыканком разьмеркаваў гэтыя месцы паміж Халоеніцкім, Бягомльскім, Лагойскім і Вузьдзенскім райёнамі.

СУД.

Хуліганы-антысэміты з гарбарні „Бальшавік".

(Менскі акруговы суд).

25-га лютага ў клюбе гарбарні „Бальшавік" распачалася судовая справа хуліганаў-антысэмітаў—рабочых Ганчарыка, Якутовіча і Тарасковіча,—якія рабілі спробу абліць разбаўленай вапнай рабочага-яўрэя т. Столяра.

Яшчэ задоўга да пачатку справы клюб «Бальшавіка» запоўніўся рабочымі ня толькі свайго заводу, але і суседніх прадпрыёмстваў.

А 6-й гадзіне ўвечары суд пачынае допыт падсудзага Ганчарыка.

Гэта ухавацень, у скуранай куртцы з бліскучастымі ботамі тып, які захаваў сваю гляндацістасць і задзёрыстасць, ня гледзячы на сядзенье ў напаўчым доме.

Як масло здарыцца, каб рабочы-партыец Ганчарык рашыўся на такі жорсткі паступак, які мог канчацца вельмі трагічна для рабочага Столяра?

У працэсе допыту выяўляецца, што Ганчарык быў адным з першых хуліганаў, антысэмітаў і бузацёраў на заводзе. Дзе толькі здарыцца які-небудзь скандал, там не абыйдзе ца без Ганчарыка. У 1927 г. Ганчарыка судзілі за бойку ў п'яным выглядзе; партыец Ганчарык ніяк ня мог паканчыць з брыдкімі традыцыямі дарэвалюцыйнага рабочага, які кожную налучку ладзіць арганізаваную выпіўку.

Праўда, Ганчарык наведваў партыйную школу, але вынікаць і буяніць значна лягчэй, чым вывучаць палітграматы, і хутка ўсе кнігі на палітграмаце паляцелі на паліпу.

Ганчарык і ў цывярозым стане не даваў патолі сваім таварышам на працы: ён мог да зьвяданьня зьбясьціць чалавека, а пад п'яную руку—дык не пападайся яму, бо пэўна ўгробіць.

Чаго-ж, аднак, дабіваўся Ганчарык у сваім выступленьні супроць Столяра?

Мэты Ганчарыка выяўляе другі падсудны—Якутовіч: Ганчарык дабіваўся, каб зрабіцца мананалістам па чыстцы ўсіх чанаў, бо за гэта плацілі звыш устаноўленай пэнсіі.

Калі-ж яўрэям-рабочым даводзілася чысьціць чаны, дык Ганчарык імкнуўся пакінуць сабе найбольш чыстыя чаны, а ім даваў найбольш забруджаныя.

Ня гледзячы на сваю самаўпэўненасьць, Ганчарык даводзі «цымяна» тлумачыць суду свой учынак. На папярэднім паказаньні Ганчарык прызнаваў сябе вінаватым, зараз-жа ён адвяргае папярэдняе паказаньне. Ён лічыў ванну ў чоп, дзе знаходзіўся Столяр гаму, што сьпіхаўся дамоў. Пусьціў ён ванну ў чоп выпадкова, выпадкова ўлілося ў чоп каля 40 вёдраў пякучай вапны, якая магла апарыць чалавека.

— А калі-б Столяр на выскачыў з чопу?—пытае старшыня суду.

— Дык Столяр мог-бы апаліцца,—лёгкавічна адказвае Ганчарык.

Так бушаваў на гарбарні «Бальшавік» гэты хуліган-антысэміт, не сустракаючы належнага адпору з боку адпавednых арганізацый. Маўклівы і цікі Столяр ня мог даць Ганчарыку адпору, бо хуліган баіцца моцных, тэрарызуючы толькі безабаронных афяры. Нездарма выхваляўся Ганчарык, што, каб у чопе быў беларус, ці паляк, дык ён бы ня пусьціў туды струмень разбаўленай вапны, бо яны маглі-б даць аплявуху, а Столяр гэтага ня зробіць.

Справа хуліганаў-антысэмітаў разглядаецца Менскім Акруговым Судом. Старшыня суду—т. Рыгарчук, члены—т. т. Капусьцінская і Давідовіч. Абвінавачвае т. Юрашкевіч, абаронца—Цэйтлін і Чысцікоў.

Да адказнасьці за нядбайнасьць у пасеўкампаніі.

Пракурор Менскай акругі даў загад аб прыцягненьні да судовай адказнасьці асоб, якія нядбайна адносяцца да падрыхтоўкі к вясеньняй пасеўнай кампаніі і да очысткі насеньня, а таксама за валакіту ў гэтай вельмі важнай справе.

2-хтыднёвік ашчаднасьці.

НЕЛЬГА ЗАБЫВАЦЬ АСНОЎНАГА.

„Двухтыднёвік ашчаднасьці" разгортваецца. У шэрагу ўстаноў і прадпрыёмстваў фабзавмясцкомы і парт'ячэйкі, разам з камісіямі садзейнічаньня рэалізацыі II пасьлі індустрыялізацыі, ужо прыступілі да працы.

Зразумела, што ўся праца па вярбоўцы ўкладчыкаў і укладаў павінна быць праведзена на добраахвотных пачатках і в гарантый тайны ўкладаў. Нажаль, факт, які меў месца ў Менску, паказвае, што на мясцох няма поўнай сьвядомасьці ў важнасьці гэтых прынцыпаў: у адной з устаноў старшыня мясцкому, імкнучыся да ўцягненьня усіх служачых і рабочых установы ў ашчадныя касы, пры абходзе ім усіх працаўнікоў установы «сурова» дапытваўся, колькі кожны супрацоўнік мае ў ашчаднай касе грошай. Зразумела, што такі мэтад зьяўляецца нягодным і можа мець адмоўны уплыў на разьвіцьцё ашчаднай справы.

Усе фабзавмясцкомы, увесь актыў, які праводзіць вярбоўку ўкладчыкаў, павінны ведаць, што тайна ўкладаў зьяўляецца нязьбломным прынцыпам у працы ашчадных кас.

Працу па ўцягненьню ўкладчыкаў базумоўна трэба праводзіць самым актыўным чынам, але пры гэтым ня трэба парушаць асноўных прынцыпаў нашай ашчаднай справы.

ПАЛЕЕС.

ХТО НАСТУПНЫ?

Усе члены арцелі «Трыкатажнік» у зьвязку з «двухтыднёвікам» уступілі ўкладчыкамі (100 проц.).

Хто наступны?

КУТОК АШЧАДНАСЬЦІ Ў КЛЮБЕ САВ.-ГАНДЛЁВЫХ СЛУЖАЧЫХ.

З 23-га лютага г. г. у клюбе савецка-гандлёвых служачых адчынен «Куток ашчаднасьці». Штодзень, апрача аўторкаў, в 7-мі да 10 гадзін у памянёным кутку праводзіцца выдача розных справак і кансультацыя па пытаньнях ашчаднае справы і дзяржаўных пазык, а таксама прымаюцца ўклады.

ШЧОТАЧНАЙ ФАБРЫКА НАПЕРАДЗЕ.

Агульны сход партыйнае і камсамольскае ячэек шчотачнае фабрыкі пастанавіў:

1. Усім партыйцам і камсамольцам зрабіцца актыўнымі ўкладчыкамі касы ашчаднасьці;

2. Склікаць агульны сход усіх рабочых фабрыкі і дамагчыся ўцягненьня 100 проц. рабочых у касы ашчаднасьці.

3. Вылучыць вярбоўшчыкаў для вярбоўкі ўкладчыкаў, абвясьціўшы спаборніцтва на лепшае вербаваньне;

4. Рэспубліканскай касе арганізаваць на фабрыцы касу ашчаднасьці для абслугоўваньня рабочых;

5. Выклікаць працалектыў тэкстыльшчыкаў на ўцягненьне 100 проц. рабочых.

ХТО НАСТУПНЫ?

Усе члены арцелі «Трыкатажнік» у зьвязку з «двухтыднёвікам» уступілі ўкладчыкамі (100 проц.).

Хто наступны?

З ЛІСТОЎ РАБСЕЛЬКОРАЎ.

„АКТЫЎНЫЯ" ЧЛЕНЫ САЮЗУ.

У Бездзяржгандлі налічваецца каля 170 чал. супрацоўнікаў—членаў саюзу. Гэтыя супрацоўнікі вельмі „актыўныя". Калі склікаюць сход членаў саюзу, дык усе разьлятаюцца, як птушкі ад выстрала гарматы. Аб калектыўным дагавору шумяцца на кутках, а сход для абгаварэньня калектыўнага дагавору больш 3-х разоў склікалі.

Свой.

ВЫЦІСНУЛІ ПРЫВАТНІКА.

Расьпянскае снажывецкае т-ва зараз узялося за скупку сьвінай і продаж сала. Вынікі атрымаліся досыць добрыя. Раней прыватнік прадаваў па 2 руб. за кілё, а т-ва прадае па 1 р. 30—1 р. 50 к; пасельніцтва вельмі здаволена гэтым.

Н. Афанасьеў.

КААПЭРАЦЫЯ, ПРАЧНІСЯ!

У мястэчку Халоенічы ёсьць сталоўка ўласьнікам якой зьяўляецца былы буйны гандляр. Сталоўка дае добры даход прыватніку.

Між тым каапэрацыі, якая выцісьнула прыватны гандаль, аб гэтай галіне ня думае.

М. Р. С.

ПІЯНЭРСКІ КЛЮБ КЕПСКА ПРАЦУЕ.

У Барысаве ёсьць піянэрскі клюб, загадчыкам якога зьяўляецца нейкі Клябанаў Шэфтэль. Праца ў клюбе праводзіцца бяз усякага пляну; загадчык клюбу абтарэштам не карыстаецца. Неабходна гаркому камсамолу заняцца справай клюбу.

УТВАРЫЛІ ЯЧЭЙКУ БЯЗБОЖНІКАЎ.

У кастрычніку мін. г. у мястэчку Лагойску з'арганізавалася ячэйка бязбожнікаў. Зараз ячэйка налічвае ўжо 103 сябра, з іх 73 мужчыны і 30 жанчын. У ячэйцы 32 партыйцаў і камсамольцаў, рэшта беспартыйныя. Зараз ячэйка ўзялася за працу.

Нозік.

Паштовая скрынка.

Азаронку Іосіфу.—Ваша заява накіравана на Віцебскай акруговай РСІ.

Бешбізу. „Грахі Сьнідзёнскага сельсавету"—накіравана Мазырскай РСІ. Гарнізіноскаму—Аршанскай РСІ.

Аўтару. «Сустрэча новага году»—Пятрыкоўскаму Райкампарту.

Жуку. «Бюракратызм»—Аршанскай РСІ.

Мыслянцу. «Хлеб у працы Слуцк. Гаркампарту.

Глазуну. «Защита кулаков»—Магілеўскай РСІ.

Ліпну. «Гатаюся паводаменьні».—вырскай АКК КП(б)Б.

Апавяшчэньні.

Фрунзаўскі райком КП(б)Б паведамляе, што ў сераду, 27-II адбудзецца нарада прапагандыстаў партыйнай школы Фрунзаўскага райёну. Пачынаецца раўна а 7 гадз. у памяшканьне АПА габінэту клюбу К. Маркса наступныя т. т.: Цыцыпэр (заг. АПА Мен. АК), Грыцкевіч, Віалько, Грушнеўскі, Гольдзін, Міранёнка, Новікаў, Ваўчок, Гарэлік, Батвінік, Парук, Лук'янаў, Рагінская, Раманаў, Самольскі, Мяцеліца, Кізераў, Ліборман і Плоткіна.

Таксама зьвяціцца ўсім прапагандыстам гурткоў прадпрыёмстваў Фрунзаўскага райёну.

АПА ФРУНЗ. РК КП(б)Б.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня, 27-II г. г. роўна а 7 гадзінавечары адбудзецца нарада гарадзкога прафактыву саюзу працасьветы (сьвяткавай групкомаў і МК, прафдэлегатаў, сьвяткавай камісій). Яўка прафактыву абавязковая.

Запрашаецца настаўніцтва.

СЬВЯТКАВАНЬНЕ АДЗНАЧЫЎ ЎКЛАДАМІ.

Сьвяткуючы XI гадавіну Чырвонай арміі, сялянс Пацкаўскага сельсавету, Крупскага райёну праводзілі вярбоўку ўкладчыкаў у касу ашчаднасьці. У часе ўрачыстага сходу ўкладчыкамі ўступіла 13 чал. На сельсавету заданьне па „двухтыднёвіку" выкананна на 88 проц.

Цытовіч.

БЕЗ ПАДРУЧНІКАЎ НЯМА ПРАЦЫ.

У Чэбатовічах, Уваражскага райёну, адчынілася вячэрняя школа для дарослых. Спачатку заняткі праводзіліся досыць рэгулярна, а ў апошні час наведваньне школы пагоршылася. Прычыны гэтага—адсутнасьць падручнікаў і навочных прыладаў.

Трэба, каб інспэктура асьветы накіравала пакамі падручнікаў, тым больш, што школу наведваюць 60 чал.

Карлоўскі С.

ПІЎНАЯ БУДЗЕ ЗАЧЫНЕНА.

На заметцы «Рабочыя патрабуюць зачыненьня піўной», вьмешчанай у нумары 260 газэты «Савецкая Беларусь», Мазырская РСІ паведамляе, што ёю прапанавана адміністрацыйнаму аддзелу АВК і Белхарчтрэсту зачыніць у г. Мазыры піўную, якая знаходзіцца каля школы і вячэрняга рабфаку.

ПІАНЭРСКІ КЛЮБ КЕПСКА ПРА